Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Сав... Беларусь

Орг... Цэнтральнага Камітэту Саветаў БССР.

10 го... ...ньня.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капярэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капярэлі паперод тэксту 1 р. — к.
За радок капярэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпецыяльны на 50 проц. дарожэй.
Зьмена тэксту бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. аддзелах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 222 (2711) Субота, 28-га верасьня 1929 г.

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, государ. стан. публічн. бібліотека. ступ. сьнэй. адзін экз.

За цьвярозую радасьць будаўніцтва.

Партыйная этыка, гэці норма партыйных паводзін, ня мае якіх-небудзь надворных падстаў. Яна цалкам грунтуецца на задачах, якія ставіць сабе партыя. Добра, заслугоўвае адобраньня, этычна ўсё тое, што палягчае наш шлях да сацыялізму, дапамагае нашаму будаўніцтву: дрэнна, заслугоўвае асуджэньня, неэтычна ўсё тое, што ставіць цяжкасьці на нашым шляху да намечанай мэты, перашкаджае нам выканаць нашу праграму. Якую ролю адыгрывае тут алкаголь, дзе крыніца патрэбы ў ім і які вынік здавальненьня гэтай патрэбы? Калі вакольнае жыцьцё цяжкае, калі няма сілы і надзеі яго зьмяніць, дык зьяўляецца жаданьне хоць паказаць сабе яго ў іншым выглядзе; для гэтага трэба затуманіць розум, заспакоіць сілу крытыкі. Гэта і дасягаецца алкаголем. Выпіеш—усё прыкрае забудзеш, усе цяжкасьці зьнікнуць, усе непрыемнасьці зьгінуць. Патрэба піць зьяўляецца ў выніку нездаволенья жыцьцём, няўменьня яго арганізаваць пасвойму, слабасьці ў справе барацьбы з акаляючымі абставінамі. Няма сапраўднага шчасьця, няма сапраўднай радасьці, створым сабе ўяўленьнем алкаголю выбражальныя радасьці, выбражальнае шчасьце. А гэта сьведчыць аб тым, што алкаголік не адчувае сучаснай радасьці, патрэбы ў сучаснай творчасьці і будаўніцтве.

Мы жывём у нязвычайную эпоху, аб ёй лепшыя людзі свайго часу марылі, гэта іх натхняла. Мы атрымалі магчымасьць, мы здабылі сабе права будаваць новы сьвет, новы парадак, у якім радасьці чалавека, сіла волі і розум, яго творчасьць і перажываньні набываюць асаблівую моц, бо гэта—воля, сіла, розум і творчасьць калектыву. І гэты калектыў павінен сьвядома і ўпарта ісьці да намечанай мэты. Кожны чалавек у нашай дзяржаве, у дзяржаве працоўных, ня можа, ня мае права прапіваць свой розум, волю і творчасьць, бо яны частка цэлага, бо будуецца калектыўнае жыцьцё.

Чыстка партыі, чыстка апарату, лёзунг самакрытыкі—усё разам падкрэсьлівае, што наша, на новых пачатках будуемая краіна прадаўляе да сваіх грамадзян суровыя патрабаваньні, ускладае на іх адказныя, сурёзныя задачы. Савецкія грамадзяне павінны ўсё больш і больш рабіцца калектывістамі, добрымі калектыўнымі работнікамі ва ўсіх галінах, упартымі і настойлівымі, а пры такіх умовах няма адкуль брацца патрэбнасьці піць. П'юць, калі нудна, калі цяжкасьці нельга перамагчы, калі ня бачыш для сябе выхаду. Хто зараз так адчувае, той чужы нам чалавек, той ня верыць у нашу творчасьць, у нашу перамогу, у нашу радасьць. Пагэтаму мы супроць п'янства, пагэтаму мы з партыі выключаем тых, хто бясьсільны перамагчы гэту слабасьць. Мы жывём у такі яскравы час работы і творчасьці, што добра ап'яняць сябе толькі волай да працы на новым будаўніцтве, захапленьнем творчасьці і энтузіязмам на гэтых шляху.

А. Сольц.

ПРАЛЕТАРЫЯТ ГАТОЎ ДАЦЬ АДПОР

ДЭМАНСТРАЦЫІ РАБОЧЫХ СУПРОЦЬ ФАШЫСТАЎ І САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАЎ.

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ КАМУНІСТАЎ З ФАШЫСТАМІ

ВЕНА, 26-IX. Учора ў Вене адбыўся сход хэймвэру, на якім прамоўцы канстатавалі салідарнасьць хэймвэру з Шобэрам і выказвалі надзею, што сацыял-дэмакраты таксама падтрымаюць новы ўрад. На сходзе хэймвэру ў Вінэр-Нойштадце таксама было выказана давер'е Шобэру. Сход гэты скончыўся сутычкай паміж хэймвэрам і камуністамі. З абодвых бакоў ёсьць параненьня. Паліцыя ўчыніла шматлікія арышты сярод рабочых.

Учора ў Вене адбылося 20 сходаў сацыял-дэмакратычнай моладзі. Наведамленьне аб назначэньні Шобэра выклікала вялікае абурэньне. Левыя сацыял-дэмакраты і камсамольцы, якія спрабавалі пратэставаць і выкрыць палітыку сацыял-фашызму, зьбіваліся. Некаторыя з іх аддадзены паліцыі.

Пасьля сходаў у 4-х райёнах сталіцы пад кіраўніцтвам камуністаў сфармаваліся дэманстрацыі пад лёзунгамі: „Прэч Шобэра і габінэт Хэймвэру". „Сьмерць фашызму". Учарашні масавы сход кампартыі супроць фашызму і сацыял-фашызму выліўся у бурны мітынг пратэсту. На сходзе прысутнічала шмат сацыял-дэмакратаў, рабочых і моладзі. Удзельнікі сходу разыходзіліся з пяньнем інтэрнацыяналу. Паліцыя разагнала іх. Назначаная на 29-е верасьня дэманстрацыя інвалідаў вайны забаронена паліцыяй.

Антываенная камуністычная дэманстрацыя.

ВЕНА, 26-9. Водлуг паведамленьня газэт, 22 і 29 верасьня ў вялікіх гарадох Румыніі адбываліся ўрачыстасьці ў гонар вайсковай авіацыі. Як паведамляюць вэнгерскія газэты, каля вайсковага аэрадрому пад Кішанёвам адбылася ў сувязі з гэтым антываенная камуністычная дэманстрацыя. Камэндант аэрадрому выклікаў паліцыю, а ледэманстранты адмовіліся разысьціся. Пасьля доўгай барацьбы дэманстрантаў абкружылі. Было арыштавана 45 мужчын і 18 жанчын. Па дарозе ў турму рабочыя спрабавалі вызваліць арыштаваных. Паліцыя страляла і забіла 1 рабочага. Цяжка параненa некалькі чалавек.

Як „судзяць" фашыстаў.

ВЕНА, 26-9. Як паведамляюць з Румыніі, бухарэсцкі вайсковы суд вынес 21-га верасьня прысуд па справе фашыстаў, якія абвінавачваюцца ў змове супроць ураду Ману. Галава змовы палкоўнік Стойко прысуджан усяго на 1 месяц зьняволеньня. Выключная мяккасьць прысуду зьяўляецца новым паказальнікам хуткай фашызацыі Румыніі.

Шобэр прэм'ерам.

ВЕНА, 26-9. Парляманцкая камісія пастанавіла запрапанаваць парляманту склад новага ўраду на чале з прэм'ерам паліцэй-прэзыдэнтам Шобэрам. Большасьцю 84-х галасоў супроць 69-ці парлямант абраў новы ўрад па прапанаванаму парляманцкай камісіяй сьпісу. Супроць галасавалі сацыял-дэмакраты. У складзе новага габінэту хрысьціянска-сацыяльная партыя прадстаўлена двума міністрамі.

* * *

ВЕНА, 26-IX. Прадстаўнікі ўрадавых партый наведалі венскага паліцэй-прэзыдэнта Шобэра і паведамілі яму, што буржуазныя партыі адназгодна вызначылі яго кандыдатам на пост канцлера. Прадстаўнікі буржуазных партый заявілі, што даюць Шобэру поўную свабоду дзейнічаньня пры складаньні новага габінэту і наогул ня ставяць яму ніякіх умоў.

Буржуазны друк вітае кандыдатуру Шобэра, называючы яго „ангелам спасіцелем" які моцнай рукой узмацніць на падставе законаў аўтарытэт дзяржаўнай улады і выведзе краіну з палітычнага і эканамічнага крызісу".

Рашучы адпор фашыстам.

ВЕНА, 25-9. У прамысловым прадмесьці Вены Лаа ўчора здарылася сутычка паміж атрадамі хэймвэру і рабочымі. Група фашыстаў, узброеных рэвальвэрамі, напала на рабочых. Апошнія далі рашучы адпор фашыстам, выгнаўшы іх з пасёлку і люта зьбіўшы некаторых з нападаўшых. З рабочых былі ў сувязі з гэтым арыштаваны паліцыяй.

Прывітаньне ЦК КП(б)Б.

VII Клімавіцкая райпартканфэрэнцыя, Магілёўскае акругі, шле пламеннае бальшавіцкае прывітаньне генэральнаму кіраўніку сацыялістычнага будаўніцтва—Ленінскаму ЦК КП(б)Б.

Канфэрэнцыя праходзіць пад знакам праверкі дасягненьняў, якія ёсьць, на падставе выкананьня генэральнай лініі партыі у справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі і барацьбы з правымі правага і левага ўхілаў і прымірэнцкіх адносін да іх.

Дасягненьні ў справе калектывізацыі райёну—на 18 проц. з аб'яданьнем у буйныя калгасы цэлых вёсак і сельсаветаў, і ўзяты курс на поўную калектывізацыю ўсяго райёну, рост прадпрыемстваў і вытворчасьці працы пры актыўным падтрыманьні і ўдзеле працоўных мас райёну—зьяўляюцца лепшымі паказальнікамі правільнай лініі партыі і ўдарам па тэорыі правых апартуністаў.

Райпартканфэрэнцыя рашуча асуджае дзейнасьць правых і прымірэнцкіх адносін да іх і патрабуе поўнага адказу Бухарынскай апазіцыі ад сваёй платформы, поўнага падпарадкаваньня пастановам партыі, у іншым выпадку—прыстасаваньня да яе выводаў, зробленых па трацкісцкай апазіцыі.

Райпартканфэрэнцыя заяўляе ленінскі ЦК, што ў далейшым ішчэ з большай згуртаванасьцю і напружанасьцю шляхам разгортваньня крытыкі і самакрытыкі і барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам будзе праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі па сацыялістычнай перабудове народнае гаспадаркі і весьці рашучую барацьбу з правымі ўхілаў ад Ленінскай лініі.

Нахай жыве Ленінскі ЦК!
Нахай жыве сацыялістычнае будаўніцтва!
Прэч малавераў і панікёраў, ухілістаў ад Ленінскай лініі партыі!

ПРЭЗЫДЫУМ VII КЛІМАВІЦКАЙ РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ.

Культурна-эканамічны рост БССР.

(Ад нашага маскоўскага карэспандэнта).

АСЫГНАВАНЬНІ САВГАСАМ БССР.

Савет Працы і Абароны пастанавіў, у мэтах выкананьня вытворчае праграмы на 1929-30 год, выдзеліць старым савгасам Беларусі (апроч калфонду) па дзяржбюджэту 2 млн. 819 тыс. руб.; па сыстэме с-г. крэдыту (у парадку доўгатэрміновага крэдыту)—2 млн. 852 тыс. руб. і па лініі Цэкабанку—175 тыс. руб.

ДА РЭАРГАНІЗАЦЫІ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ БССР

Прадстаўнікі БССР заявілі ў Савет Працы і Абароны, што яны лічаць мэтазгодным пакінуць існуючае ў БССР палажэньне, як адпавядаючае мэтам рэарганізацыі лясной гаспадаркі і лясной прамысловасьці, вызначаным у пастанове Савету Працы і Абароны. У мэтах вопыту прадстаўнікі БССР прызнаюць мэтазгодным перадаць прамысловасьці ў доўгатэрміновае карыстаньне адзін лясны масыў (з некалькі лясьніцтваў).

МЕРЫ ДА ПАЛЕПШАНЬНЯ СТАНОВІШЧА ІНЖЫНЭРАЎ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ.

У цэнтры праэктуецца апублікаваньне закону аб новых мерапрыемствах, неабходных для палепшаньня становішча на транспарце з інжынэрнымі кадрамі. Гэта выклікана слабым прытокам на чыгуначны транспарт спэцыялістаў.

Мяркуецца абавязаць Наркамгандаль СССР накіроўваць маладых спэцыялістаў, якія скончылі транспартныя аддзяленьні ВТУЗ'аў і ВУЗ'аў і знаходзяцца ў веданьні Наркамасьветы рэспублік, у першую чаргу для скарыстаньня на транспарце. Будуць таксама ўжыты меры да перагляду ўстаноўленых па дзярж. нарміраваньню акладаў на транспарце ў бок іх павышэньня, з прыраўнаньнем спэцыялістаў транспарту да аплаты ў прамысловасьці.

Сталае прадстаўніцтва БССР у Маскве паведаміла НК Шляхаў Зносін, што ўрад БССР згодзен з праэктам новай пастановы СНК СССР па пытаньню аб інжынэрных кадрах на транспарце.

ДА БАРАЦЬБЫ СА ШКОДНІКАМІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў БССР.

Як вядома, у сувязі са зьяўленьнем у межах Беларусі сёлета масавага шкодніка—вусеняў лугавога матылька і совкі-гамы, запас атруты ў сыстэме с.-г. каапэрацыі БССР вычарпан. У Беларусі чакаецца зьяўленьне другога пакаленьня гэтых шкодникаў, між тым адсутнасьць атруты пазбаўляе магчымасьці весьці з імі барацьбу.

Прыняты меры да высылкі ў БССР сродкаў барацьбы са шкодникамі.

БССР І ВЫСТАЎКА НОВАГА ПІСЬМА НАРОДАЎ СССР.

Камуністычная Акадэмія Навук пры ЦВК СССР зараз арганізуе выстаўку—„Новая письменность народов СССР". На гэтай выстаўцы будуць прадстаўлены ўсе выданьні на мовах народаў БССР, якія датычацца пытаньняў лінгвістыкі, у прыватнасьці пытаньняў пісьма (орфографічныя справачнікі, узоры пісьма, альфабэты народаў БССР і г. д.).

Для арганізацыі разьдзелу пісьма народаў БССР на гэтай выстаўцы Камуністычнай Акадэміяй прыцягнуты тав. Пец юкевіч. Экспанаты для выстаўкі загатаўляюцца ў Менску.

ДА АБКЛАДАНЬНЯ ТЫЛААПАЛЧЭНЦАЎ ВАЙСКОВЫМ ПАДАТКАМ.

Згодна закону, абкладаньню вайсковым падаткам падлягаюць грамадзяне залічаныя ў тылавое апалчэньне, пачынаючы з прызыву 1925 г., а таксама грамадзяне, залічаныя ў каманды абслугоўваньня пры прызыве 1924 г. але якія фактычна не адбылі службы ў гэтых камандах.

Такім чынам, грамадзяне старэйшага ўзросту, у выпадку пералічэньня іх у тылавое апалчэньне, вайсковым падаткам зусім не абкладаюцца.

Зараз НКФ СССР пастанавіў, што усе без выключэньня тылаапалчэнцы, незалежна ад іх узросту, павінны абкладацца вайсковым падаткам. Акроч таго, праэктуецца адзавіць рэшту дзейнічаючае правіла, згодна якога па тылаапалчэнцаў, якія маюць самастойных крыніц прыбытку, вайсковы падатак павінны плаціць іх бацькі ці тыя асобы, на ўтрыманьні якіх яны знаходзяцца.

Праэкт пастановы па гэтаму пытаньню НКФ СССР прадставіць на заключэньне ўраду БССР.

250 ПАНЧОШНЫХ МАШЫН ДЛЯ ВІЦЕБСКАЙ ФАБРЫКІ.

Прэзыдыум ВСНГ РСФСР катэгарычна запрапанаваў прэзыдыуму Маскоўскага Савету Народнай Гаспадаркі выканаць да 1 кастрычніка пастанову маскоўскай РСІ аб водпуску праўленьнем трэсту „Мострыкатаж" віцебскай панчошнай фабрыцы 250 панчошных машын.

БЕЛАРУСЫ СССР НА ПРОВАДАХ ДЭЛЕГАЦЫІ ПРАЦОЎНЫХ ПОЛЬШЧЫ

На ініцыятыве маскоўскага камітэту УсеКП(б) учора адбыўся ў Маскве „Інтэрнацыянальны вечар", прысьвечаны провадам з СССР делегацыі працоўных Польшчы і Заходняй Украіны.

Усеагульную ўвагу шматлікай аўдыторыі прыцягнула выступленьне на гэтым вечары беларусаў СССР. Ад імя беларускай калёніі ў Маскве (калёнія налічвае да 20000 чал.) делегацыю вітаў т. Бурдыка.

На вечары пасьпяхова выступалі: паэта Паўлюк Шукайла (дэклямаваў адрыўкі з паэмы «Партызанка Люба»); запрошаны з Віцебску цымбаліст Навіцкі і 2 салісты з маскоўскага цэнтральнага беларускага клюбу.

ДА АПЛАТЫ РАБОЧЫХ, ЯКІЯ ВУЧАЦЦА НА ВЯЧЭРНІХ РАБФАКАХ.

Аддзел рабфакаў Галоўпрафасьвіты пры Наркамасьвеце РСФСР паведаміў маскоўскае прадстаўніцтва БССР, што для рабочых, якія вучацца на вячэрніх рабфаках, устанаўляецца ў дні заняткаў 6-цігадзінны рабочы дзень. Аплата ільготных гадзін праводзіцца за кошт вытворчасьці. Падрабязная інструкцыя аплаты распрацоўваецца зараз НК Працы РСФСР.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ВАПНАВАНЬНЯ.

Эканамічная нарада пры СНК ускладала на наркомаў земляробства аўтаномных рэспублік і на загадчыкаў зямельнымі органамі райёных і вышэйстаячых выканкомаў пэрсанальную адказнасьць за выкананьне пляну вапнаваньня ў асеньні пэрыяд пры зяблевай успашцы і за падрыхтоўку да вапнаваньня глебы на 1930 год. Прамысловай каапэрацыі запрапанавана зараз-жа пусьціць у ход усе райённыя вучастковыя машыны. На гэтых машынах павінна весьціся бязупынная праца.

Эканамічная Нарада дала таксама шэраг дырэктыў адносна зьніжэньня кошту молатага вапняку, загатоўкі сыравіны і нагляду за выкананьнем усіх дырэктыў ураду па гэтаму пытаньню.

Эканамічная Нарада даручыла пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў праўленьняў будаўнічага кантролю бездакладна прыцягваць да адказнасьці вінаватых у ажытажы і спэкуляцыі на рынку будаўнічых матар'ялаў. Павінны таксама прыцягвацца да адказнасьці і арганізацыі, якія трымаюць у сябе больш будаўнічых матар'ялаў, чымся ім на самай справе патрэбна дзеля будаўнічых работ. У розных савецкіх установах працуе не па сваёй спэцыяльнасьці вялікая колькасьць асоб, якія маюць спэцыяльна тэхнічную адукацыю і вопыт па будаўніцтву.

Эканамічная Нарада пры СНК РСФСР прызнала патрэбным, каб прадставіць на разгляд ураду пэраг захадаў, накіраваных да прыцягненьня гэткіх кваліфікаваных работнікоў да будаўнічай працы на спэцыяльнасьці.

100.000 р. на далейшыя досьледы

МАСКВА, 27-IX. СНК СССР, адзначаючы 80-цігодзьдзе з дня нараджэньня акадэміка Паўлава і яго выключную па свайму значэньні навуковую дзейнасьць, пастанавіў: прызнаць неабходным далейшае забясьпечаньне найбольш спрыяючых умоў дзеля навукова-дасьледчай працы фізіялёгічнай лябар аторыі пры Дзяржаўным інстытуце экспэрымэнтальнай мэдыцыны, якая знаходзілася пад кіраўніцтвам Паўлава.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў Саюзу ССР прадугледзець у бюджэце на 1929-30 бюджэтны год 100.000 рублёў на пераабсталяваньне паказанай лябараторыі і дзеля пабудовы новага будынку біялёгічнай станцыі, якая знаходзіцца пры ёй.

Імпэрыялісты рыхтуюць бойню.

МОСКВА, 26-IX. Перад ад'ездам у Скандынавію скандынаўская рабочая делегацыя, якая гасьціла ў СССР перадала УсеЦСПС дэкларацыю, у якой паміж іншым, гаворыцца:

„У той час, калі мільённыя масы працоўных СССР будуюць сацыялізм, у імпэрыялістычных дзяржавах ідзе падрыхтоўка да вайны, у першую чаргу супроць Савецкага Саюзу.

Скандынаўская рабочая делегацыя абяцае працоўным масам СССР усімі сродкамі і сіламі ўдзельнічаць у барацьбе супроць ваенных падрыхтованьняў, салідарна выступаючы на абарону адзінай бацькаўшчыны працоўных.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

НАПАД НА МІТЫНГ.

ВАРШАВА, 24-IX. У Таргавіцах адбыўся мітынг арганізаваны дэпутатам аб'яднанага сельроба Сянюком. Польскімі вайсковымі пасяленцамі пры падтрыманьні паліцыі быў учынен напад на гэты мітынг. Нападаўшыя моцна зьбілі некалькі чалавек і параніілі штыкавым ударам аднаго з удзельнікаў мітынга Ткачука. Удзельнікі мітынгу арганізавалі дэманстрацыю, наперадзе якой несьлі на руках параненага Ткачука.

Канфіскацыя газэт.

ВІЛЬНЯ, 17-IX. Па загаду гарадзкога старосты канфіскавана „Жыцьцё Люду" № 17 за артыкул «Скуткі неўласьцівай палітыкі».

Артыкул абгаварваў беларускія справы ў зьвязку з выданьнем леманту Любіч Маеўскім.

ВАРШАВА, 17-IX. Як паведамляе „Роботнік" паліцыя канфіскавала газэту „Подзянін".

Племя Ачакзані супроць Хабібулы

ЛЁНДАН, 26-9. Рэйтэр паведамляе: „У Пэшовары прайшла чутка, што Кабульскі ўрад накіраваў англа-індыйскаму ўраду пратэст у сувязі з паўстаньнем у Кандэгары. Кабульская ўлада сьцьвярджае, што ангельцы прапусьцілі праз сваю тэрыторыю ў валоціцы Кандагара 4-х афіцэраў Надзір-Хана (галоўны супраціўнік Хабібулы). Прыбыўшы туды, афіцэры Надзір-Хана паднялі супроць Кабулу племя Ачакзані і гэта быццам паклала пачатак паўстаньню, якое прывяло да пераходу Кандагару ў рукі ворагаў Кабулу".

„ПАРУШАН" ПРЫНЦЫП ТАЙНАЙ ДЫПЛЁМАТЫІ

ЛЁНДАН, 26-9. Дыплёматычны агляльнік «Дэйлі Тэлеграф», падкрэсьліваючы адсутнасьць афіцыйнага паведамленьня аб учарашнім спатканьні Доўгалеўскага і Гендэрсона, піша: «Заява Даўгалеўскага выклікала сур'ёзнае замяшаньне і некаторае раздражненьне ў урадавых колах. Магчыма, што савецкага прадстаўніка паведамілі аб цяжкасьцях, выкліканых яго публічнай заявай, і далі яму зразумець, што ў урадавых колах спадзяюцца на тое, што ён больш строга будзе прытрымлівацца прынцыпаў тайнай дыплёматыі.

У БАРАЦЬБЕ З АНГЕЛЬСКІМ ІМПЭРЫЯЛІЗМАМ.

ЛЁНДАН, 26-9. Як паведамляюць з Індыі, Сапіндра Сен зьняволены ў горадзе Барысале (Бэнгальская правінцыя) па абвінавачаньні ў забойстве інспэктара паліцыі, абвясьціў галадоўку. Карэспандэнт „Таймса" піша з Калькуты, што абвінавачаньне галадоўкі перад судом стала ў Індыі формай праўленьня нацыянальнага гэраізму. У Барысале—напружаны настрой. Горад перапоўнен паліцыяй.

Зноў разгараецца грамадзянская вайна ў Кітаі

10 ПУНКТАЎ АБВІНАВАЧАНЬНЯ ЧАН-КАЙ-ШЫ

ШАНХАЙ, 27-IX. Ван-Цзін-вэй апублікаваў адозву супроць Чан-Кай-шы. Адозва пералічае 10 пунктаў абвінавачаньня, якія прад'яўляюцца Чан-Кай-шы: 1) пры дыктатуры Чан-Кай-шы сквапнасьць і хабарніцтва чыноўнікаў дасягнулі больш вялікія разьмеры, чымся ў часы панаваньня нанкінскай ураду; крадёж, прысваеньне грамадзкіх грошай і продаж пасад захвочваюцца, 2) дробныя чыноўнікі, у большасьці—сваякі вышэйшых чыноўнікаў, 3) Чан-Кай-шы манапалізаваў фінансы в мэтаю здавальненьня сваіх уласных патрэбаў; калі не хапае грошай, выпускаюцца без абмежаваньня папяровыя грошы, 4) з таго часу, як Чан-Кай-шы ва ўладзе, здарыўся шмат няпраўных забойстваў і няпраўных канфіскацый в мэтаю здавальненьня крывяжэрных апэтытаў і сквапнасьці чыноўнікаў, 5) Чан-Кай-шы пад прычынай дэмабілізацыі зрабаваў народнае багацьцё і распусьціў войска сваіх ворагоў, каб умацаваць сваё становішча, 6) Чан-Кай-шы імкнуўся прыдушыць законае патрабаваньне народу вывесьці рэшткі феадалізму, 7) у імкненьні ўзмацніць сваё асабістае становішча, Чан-Кай-шы заключыў в суседнімі дзяржавамі дагаворы, які зьняважлівы дзеля краіны і прыносяць у ахвяру нацыянальныя правы. Урад Чан-Кай-шы разбураў сыстэму судавытворчасьці, утвараючы няпраўныя арышты, ня спыняючыся перад мучэньнямі і няпраўнымі забойствамі і казьнямі, даючы, гэткім чынам, дзяржавам яшчэ адзін повад дзеля адмовы выканаць кітайскія патрабаваньні аб зьнішчэньні экстэрытарыяльнасьці, 8) замест таго, каб заклікаць да народнай барацьбы супроць Японіі ў часы цзынаньскага інцыдэнту, Чан-Кай-шы заключыў сакратную згоду, у выніку якой жыцьцёвыя правы Кітаю перайшлі да Японіі, Шаньдуньская чыгунка ператварылася на другі Манжурскі шлях, на якім пануюць японцы, 9) сьцьверджаньне Чан-Кай-шы, што народ ня здолен кантраляваць урад, супярэчыць навучаньню Суп-Ят-Сэна і 10) Чан-Кай-шы сказіў праграму Гоміндана і ўвесь час дамагаўся разбурэньня партыі, склікаўшы 3-ці кангрэс, на якім большасьць дэлегатаў складалася з яго „назначэнцаў". Адозва заклікае да ўпартай, незамірнай барацьбы супроць Чан-Кай-шы, які прадае інтарэсы краіны і народу. Над адозвай значыцца: „выпушчана аб'яднаным бюро правінц. арганізацый Гоміндана і замежнымі бюро Гоміндана"

МАНІФЭСТ СУПРОЦЬ НАНКІНА

ШАНХАЙ, 26-IX. За подпісамі Ван-Цзін-Вэя і іншых прыхільнікаў „партыі рэарганізацыі" апублікаваны маніфэст супроць Нанкіна. Падрабязны зьмест маніфэсту яшчэ невядомы.

* * *

ШАНХАЙ, 26-IX. З Манчжурскіх крыніц паведамляюць, што першая брыгада войск Чжан-Фа-Гуя разброена хэнаньскім войскам, прычым звыш 2.000 чалавек узята ў палон. Адначасова з афіцыйных колах паведамляюць, што частка войска і афіцэраў Чжан-Фа-Гуя паведамілі Нанкін аб сваёй лаяльнасьці да цэнтральнага ўраду.

„ЛЁГКІ У СПРАВАХ З КАРАХАНАМ".

ПЭЙПІН, 26-9. Водлуг паведамленьня „Норд Чайна Стандарт", мукдэнская ўлада зьвярнулася да нанкінскага ўраду з просьбай ануліраваць загад аб арышце Велінгтона Ку (вядомы кітайскі дыплёмат, былы міністар замежных спраў) і заклікаць яго зноў да дзейнасьці. Водлуг думкі мукдэнскай улады, у Велінгтоне Ку адчуваецца вострая патрэба таму, што «ён адзначаецца дзіўнай лёгкасьцю ў справах з Караханам». Жадаючы выкарыстаць Велінгтона Ку дзеля перамоваў з СССР, манчжурская ўлада чакае ў бліжэйшай будучыні яго прыезду ў Мукдэн.

Прымусілі спыніць.

УЛАДЗІВАСТОК, 25-IX. Сёньня з раніцы кітайскія салдаты ў райёне Пагранічнай зноў абстралялі пагранзаставу. Пасьля нашага адказнага агню абстрэл спыніўся.

ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ З НЬЮ-ЁРКУ.

БЭРЛІН, 26-9. У цэнтры ўвагі эканамічных і палітычных колаў стаіць зараз будучае зьліцьцё „Дэйчэ Банк" з „Дысконто Гезельшафт". У выніку зьліцьця банкі будуць мець акцыянэрны капітал у 285 мільёнаў марак, і ўклад у разьмеры 4 мілярдаў 300 міл. марак, што складае 28 проц. сумы ўкладаў усіх нямецкіх банкаў.

Водлуг вестак эканамічных колаў, ініцыятыва зьліяньня паходзіла з Нью-Ёрку. Член праўленьня „Дэйчэ Банк" Келем нядаўна заявіў, што лічыць мэтазгодным уступіць замежнаму капіталу частку акцыянэрнага капіталу Нямеччыны, каб выклікаць новы прыток замежнага капіталу ў нямецкую гаспадарку.

Сыстэматычнае крушэньне паяздоў.

ТОКІЁ, 26-9. Як паведамляюць з Харбіну, крушэньне на УК чыгунцы носіць сыстэматычны характар. На Мулінскай галіне пацарпеў крушэньне цягнік і вагоны, якія былі нагружаны вуглем. На ўсходняй галіне начны рух цягнікоў зусім спыніўся. Таварны цягнік, які накіроўваўся са станцыі Пагранічнай, пацарпеў крушэньне. Зусім разьбіты 13 вагонаў. Пацарпеў крушэньне таварны цягнік на другой станцыі.

Арганізацыя дывэрсыйных банд.

ХАБАРАЎСК, 26-IX. Водлуг атрыманых вестак, у горадзе Хулічан (каля гораду Ман) фармуецца спэцыяльны кітайскі атрад з радавых кітайскіх салдат дзеля дзейнічаньня ў нашым тылу. Атрад мае намер перайсьці на нашу тэрыторыю ў цывільнай вопратцы і ўчыняць рабункі і забойствы насельніцтва.

ЧЫТА, 25-IX. 24-га верасьня з райёну Трохрэчча, дзе жывуць белагвардзейцы, насупроць Балдубруй (30 кілёмэтраў на паўдзённы захад ад Нерчынскага заводу) пераправілася на нашу тэрыторыю белая банда ў складзе 25 шашак. Прыняты захады да зьліквідаваньня гэтай банды.

Антысавецкая прапаганда.

ТОКІЁ, 26-9. Апублікавае сьпіс новых служачых УК чыгункі. Усе яны былой армії Грумава. Кіраўнік шляху дзеля знаёмства з новымі працаўнікамі наладзіў сьнеданьне, у якім выступалі з прамовамі супроць Савецкага Саюзу.

Новы дарадчык Чан-Кай-Шы.

ЛЁНДАН, 24-9. „Дэйлі Тэлеграф" паведамляе, што Чан-Кай-Шы запрасіў у якасьці вайсковага дарадчыка, замест памёршага палкоўніка Бауэра, палкоўніка Крыбеля, былога афіцэра баварскага штабу і ўдзельніка гітлероўскага путчу.

Перамовы з ПАЗШ аб пазыцы.

ТОКІЁ, 26-IX. Водлуг вестак японскага друку, пытаньне аб забясьпечаньні войск паўночнай Манчжурыі харчамі робіцца ўсё больш вострым. Крытычнае становішча ў гэтай галіне узмацняецца тым, што кітайскаму ўраду даводзіцца плаціць 20.000 іен у дзень за харчы, якія рэквізіруюцца дзеля войска.

Нядаўна мукдэнская ўлада спрабавала выйсьці са становішча шляхам выпуску новых банкнотаў. Гэта выклікала заняпад мукдэнскай валюты, бо выявілася, што пакрыцьцё складае ня 7 мільёнаў іен, а толькі 3 мільёны. Гэткія-ж махінацыі цяжка адбіваюцца на жыцьці Манчжурыі. У афіцыйных колах Токіё атрыманы весткі, што Мукдэн вядзе з амэрыканцамі перамовы аб пазыцы 20 мільёнаў кітайскіх долараў пад заставу амурскіх капальняў

Рабуюць УК чыгунку на карысьць арміі.

ТОКІЁ, 26-9. Як паведамляюць з Харбіну, кітайскае камандаваньне рыхтуе зімнія кватэры для войска. Старшыня праўленьня УК чыгункі зрабіў распараджэньне выдаць са сродкаў шляху 3 мільёны долараў на абмундзіраваньне арміі. З Францыі прыбыў вялікі груз аэраплянаў, якія будуць несьці службу ўдоўж савецкай мяжы.

Атрады самаабароны.

ПЭЙПІН, 26-9. У 683-х вёсках на ўсход ад Пэйпіну арганізаваны атрады самаабароны дзеля абароны ад бандыцкіх шаек.

НА 40 МІЛІЁНАЎ ФУНТАЎ СТЭРЛІНГАЎ.

ЛЁНДАН, 26-9. Падвышэньне вучотнага процанту з 5½ да 6½, зробленае ангельскім банкам з прычыны замяшаньня на грашовым рынку, адабіецца на становішчы прамысловасьці і зробіць яшчэ больш цяжкай барацьбу ўраду з беспрацоўем. Шырока распаўсюджана думка, што вучотны процант быў-бы павышан яшчэ некалькі тыдняў таму назад, калі-б Споўдэн не супраціўляўся гэтаму па палітычных меркаваньнях. Павышэньне вучотнага процанту павінна, відавочна, спыніць адліў золата з Лёндану. За год залаты запас паменшыўся на 40 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

ПРЫНЯЦЬ РАШУЧЫЯ МЕРЫ.

БЭРЛІН, 26-9. У сувязі з палётам польскіх вайсковых аэраплянаў над горадам Лаўрэнбургам—у 15 вярстах ад польска-нямецкай мяжы, нямецкая народная партыя ўнесла ў парлямант запрос, у якім, зазначаючы на частыя выпадкі палётаў польскіх аэраплянаў над нямецкай тэрыторыяй. Народная партыя патрабуе ад ураду прыняць рашучыя крокі супроць парушэньня Польшчай недатыкальнасьці нямецкай тэрыторыі.

Замах на самагубства.

ТОКІЁ, 26-IX. Выдатны лідэр групы Рэно (новая рабоча-сялянская група) Арахата замахваўся 21 верасьня на самазабойства, але няўдала і зараз знаходзіцца ў больніцы.

Арахата рашыў пакончыць з сабой на падставе заявы пракурора, што нібыта яго

НАХАБНАЯ ВЫЛАЗКА БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМУ.

Пад маскай прыхільніка да беларускай літаратуры.

Пасьля таго, як вядомы «труд» Клейнборта «Молодая Белоруссия» спатлаў належную ацэнку ў нашай беларускай прэсе, здавалася-б што спрытнаму „белоруссоведу“ ня ўдасца так проста і лёгка пралезьці на старонкі друку з новай спробай „пазнаёміць“ расійскага чытача з „дасягненьнямі“ беларускай літаратуры.

Аказваецца, выратавацца ад гэткіх „прыхільнікаў“ беларускай літаратуры, як Клейнборт, ня так проста.

Сёньня мы маем справу з новай вылазкай неўгамоннага „літаратуразнаўцы“. Расійская часопісь пралетарскіх пісьменьнікаў „Резец“ выпусьціла „Альманах белорусской литературы“, а прадмову да гэтага „Альманаху“ даў... Клейнборт.

Часопісь „На літературным посту“ зусім правільна зрабіла, зьмясьціўшы на сваіх старонках артыкул „Аб агэнтуры беларускага нацыянал-дэмакратызму“.

Падаючы ніжэй гэты артыкул, мы зараз цікавімся пытаньнем папулярызацыі дасягненьняў беларускай літаратуры сярод расійскіх чытачоў, як з боку ідэалёгічнага, так і арганізацыйнага.

Азнаямленьне з дасягненьнямі беларускай літаратуры, па нашай думцы павінна быць больш арганізаваным і весьціся праз людзей, якія добра ведаюць беларускую літаратуру, з ёю непасрэдна зьвязаных, людзей, якія могуць даць асьвятленьне беларускай літаратуры без анты-марксысцкіх памылак і нацыянал-дэмакратычных тэндэнцый, якія знашлі яскравы выраз у прадмове Клейнборта.

„Труды“ Клейнборта—гэта крывое люстэрка, праз якое расійскі чытач правільнага ўяўленьня аб дасягненьнях беларускай літаратуры не атрымае.

Другая нацыянал-дэмакратычная вылазка Клейнборта дае нам права быць упэўненым, што тут мы маем справу куды больш, чым з простай „невежественностью“.

Аб агэнтуры беларускіх нацыянал-дэмакратаў*).

Рускага чытача пачалі знаёміць з літаратурай народаў СССР. Пачата карысная справа. Але кепска тое, што часта робяць яе насьпех, паказённаму—толькі-б як найхутчэй адчапіцца, а часамі з зразумелымі адносінамі: ну-ка, масквіч, паглядзім, якая такая экзотыка завялася на савецкіх акраінах...

„Резец“, часопісь пралетарскіх пісьменьнікаў, які выходзіць пры непасрэдным удзеле працаўнікоў ЛАПП, выпусьціў «Альманах белорусской литературы». Ён абяцае выдаць сэрыю аналёгічных альманахаў. Паглядзім, які падарунак паднёс „Резец“ беларускім пралетарскім пісьменьнікам і рускім рабочым чытачом.

Калі за межамі выходзяць альманахі расійскай літаратуры, у якіх Замяцін мірна супрацоўнічае з Лібядзінскім, мы сьмяёмся або абураемся: літаратура—гэта зусім не таварыства філатэлістаў, альманахі—зусім не альбомы, дзе сабраны на роўных правах усе маркі ўсіх дзяржаў. А ў той-жа час у савецкіх друкарнях, пад савецкай рэдакцыяй, выходзяць альманахі „нацыянальнай літаратуры“, якія зьбіраюць на сваё мірнае лона прадстаўнікоў усіх клясавых кірункаў у літаратуры. Па такому прынцыпу складзен і альманах „Резца“. Нацыянальная літаратура, весь экзотычна; ці варта гаварыць аб клясах, калі гутарка ідзе пра нацыянальнасьць?

Не, мы не прычэпны. Гэта думка, хоць і іншымі словамі, выкладзена ў прадмове да «Альманаха». Прадмова-ж і ёсьць той галоўны падарунак, які „Резец“ паднёс беларускай пралетарскай літаратуры.

Прадмова падпісана „Л. К“. Мы бяз болькі парушаем права псэўдонімнай тайны, бо прадмова разьвівае тыя-ж думкі (і часамі ў тых-жа фармуліроўках), што і кніжка Л. Клейнборта „Маладая Беларусь“. Аб гэтым важкім вэлюме В. Сутырын змушан быў напісаць спэцыяльны артыкул („Минский марксизм—ленинградского издания“, „На лит. посту“, № 7 за 1929 г.). Аўтар прадмовы—вядомы ад гэтага часу Л. М. Клейнборт.

Л. Клейнборт—зусім ня вузкі дасьледчык літаратуры. Не, гэты жвавы дзядок у сваёй пахвальнай руплівасьці складае ўсесахапляючую схэму гісторыі Беларусі апошніх вякоў. Самае выдатнае выкрыцьцё, зробленае ім, зьяўляецца ў тым, што на Беларусі ня было клясаў... Іншымі словамі, прызнаецца Клейнборт, клясавае разьмежаваньне было, але толькі па нацыянальных адзнаках: кожная нацыянальнасьць—асобная кляса.

Ды ўжо будзе вам,—зьдзівіцца чытач,—адкуль вы зваліліся? Пашто ўзводзіць паклёп на ледзь-ледзь не акадэміка? Не, гэта не паклёп. У самым пачатку прадмовы Клейнборт піша: „Вось што трэба перш усяго ня выпускаць з-пад увагі: нацыянальнасьці і клясы, інтарэсы нацыянальныя і клясавыя супадалі... У выніку здарылася так, што польскія аграрыі выяўлялі сабой земляўладаньне, расейскае чыноўніцтва—царызм, яўрэі-гандляры—дробную і сярэднюю буржуазію, беларусы-ж—галоўным чынам, бядняка-серадняцкую масу сялянства“.

Гэта схэма няпісьменная. Што напрыклад, азначае ў агульным кантэксьце сказ: „расійскае чыноўніцтва выяўляла царызм?“ Ці ўваходзіла польскае буйнае земляўласьніцтва (роля „Польского Коло“ у дзяржаўнай думе!) складаным часткай у сыстэму царызму? Ці вычэрпваецца яўрэйскае насельніцтва гандлярамі? А куды падзеліся яўрэйскія рамесьнікі і рабочыя? Але ставіць такія лемантарныя пытаньні Л. Клейнборту бескарысна. Л. Клейнборт ведае пра што ён піша. Ён ведае, чыю сыстэму поглядаў ён так няпісьменна выкладае.

Гэта—сыстэма поглядаў беларускай буржуазнай „нацыянальнай дэмакратыі“. Сутнасьць сыстэмы—у «зьвядзеньні» клясавай барацьбы да нацыянальнай праблемы, у сьцьвярджэньні аднаклясавасьці і безбуржуазнасьці беларускай нацыянальнасьці, у адхіленьні ролі пралетарыяту Беларусі, як авангарду пралетарскай рэвалюцыі. Мы ўжо бачылі, як Л. Клейнборт даказвае „безбуржуазнасьць“ беларускага народу. Мы зараз убачым, як ён гавора аб пралетарыяце.

„З адыходам найбольш здольных, „Маладняк“, як гаворыцца, абмялеў“. Гэта асабліва адбілася па часопісу „Маладняк“, на яго прыхільнасьці да таннага „марксызму“, на яго зацёртых словах аб «менскім індустрыялізьме», за якімі стаіць схэма і да таго-ж схэма чыста-местачковага тону... Для таго, каб гэта моладзь вышла на дарогу, патрэбны зьмены ў гаспадарчым фундаманце краіны, у сацыяльных групоўках шырокіх народных мас. Толькі тады ўсё, што нясе з сабой горад,—рэвалюцыйны горад з яго індустрыяльнай будучыняй, увойдзе ў гісторыю гэтай літаратуры... Для пралетарскай літаратуры яшчэ няма тут адпаведнай матар'яльнай глебы (разрадка Л. Клейнборта.-Рэд.). І ў другім месцы: „У нас няма такога пралетарыяту, які даў-бы сваіх паэтаў“.

„Маладняк“, які паклаў пачатак Беларускай асоцыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў у лістападзе 1928 г. (аб беларускай АПП—ні слова ў альманаху „Резца“!), сапраўды перажывае трудны час першапачатковага накапленьня сіл пралетарскай літаратуры. Аб'ектыўныя цяжкасьці ўзрастаюць яшчэ ў зьвязку і з тым, што Наркамасьветы Беларусі праводзіць клейнбортаўскую палітыку ў літаратуры, што з боку шэрагаў органаў беларускай АПП не сустракае патрэбнага падтрыманьня, што яе часопісь пастаўлена ў горшыя выдавецкія ўмовы, што ў савецкім апараце да яго адносяцца таксама (калі ня горш), як і да часопісі, якая стаіць на мяжы з новабуржуазнай літаратурай—да „Узвышша“. Мы бачым слабыя месцы „Маладняка“. Але Л. Клейнборт нападае якраз на яго моцныя месцы, на яго прынцыповыя пазіцыі, на яго клясавы сьцяг, на яго ганаровую ролю валўнічага прадстаўніка пралетарыяту ў галіне культуры, бо „Маладняк“ зьяўляецца адзінай беларускай літаратурнай часопісьсю, якая зрывае нацыянал-дэмакратычныя маскі клясавага сьвету ў літаратуры. Л. Клейнборт гаворыць аб „менскім індустрыялізьме“, аб „местачковай схэме“. Мы без асаблівай цяжкасьці выяўляем сацыяльна-лінгвістычныя карэньні яго тэрміналёгіі. Гэта—мова нацыянал-дэмакрата. Гэта з таго-ж слоўніка, што і „местачковы марксызм“, „сэльцэрскі пралетарыят“ і інш.

Нацыянал-дэмакрат супраціўляецца наступу пралетарыяту на ўсіх участках, у тым ліку і на ідэалёгічным. Ён хоча адсунуць пралетарыят крыху назад; а калі гэта ня ўдасца зрабіць у эканоміцы, ён шукае рэванш у ідэалёгіі. І тут прыходзіць „елейный“ Клейнборт і робіць сваю справу; ніхай пасунецца пралетарская літаратура з яе „местачковымі тонамі“. Няхай спачатку „нескладаная“ Беларусь стане новым Чыкаго, новым Рурам або Ленінградам, вось тады і будзе пралетарская літаратура, вось тады і будзе „адпаведная матар'яльная глеба“. На дапамогу нацыянал-дэмакратызму выцягваецца запылены меншавіцкі падручнік.

Па-Клейнборту—для таго, каб культурная рэвалюцыя (г. зн., „між іншым“, рашучая перамога пралетарыяту ва ўсіх галінах ідэалёгіі) утваралася, трэба пабудаваць сацыялізм. Але сацыялізм немагчыма пабудаваць без культурнай рэвалюцыі. Узьнікшую „супярэчнасьць“ можна толькі паставіць на адну ступень з дзесяцігатунковым эстраднікам. Што-ж тут ужо гаварыць пра марксызм?

Але ці сур'ёзна лічыць сябе Клейнборт «спачуваючым» марксызму? У яго «Прадмове» мы чытаем: „Рэвалюцыйны марксызм дыктуе новаму пакаленьню аптымізм. Зразумела, гэта марксызм, які толькі магчымы ў абставінах беларускага Менску“. Што гэта? Зьдзек? Цэмра?—Мабыць, і тое і другое: цёмны зьдзек ці цэмра, якая аб'ектыўна прыводзіць да зьдзеку.

Клейнборт бярэ працэс культурнага разьвіцьця беларускага народу ў яго адмежаваньні ад культурнага разьвіцьця суседніх народаў, ад агульнай заканамернасьці культурнай рэвалюцыі ў СССР.

Ён гаворыць аб горадзе і сяле ў беларускай літаратуры, але ў горадзе ён ня бачыць пралетарыяту, а ў сяле—кулака. Ён сьцьвярджае, што клясавае разьмежаваньне ў беларускай літаратуры тлумачыцца розьніцаю „фармальных потэнцый“. Ён проста абдурвае чытача, скажаючы і хаваючы ад яго досыць цікавыя факты. Падамо адзін з іх.

У мінулым годзе беларускі паэта, камсамолец Дудар-Глыбоцкі, узьняў тэатральную дыскусію. Ён пратэставаў супроць таго, што на беларускай сцэне ставяцца перакладзеныя з расейскай мовы п'есы („Бронепоезд“, „Мяцеж“). Нацыянал-дэмакраты радасна віталі „сьмелы голас“ Дудара. А праз кароткі час Дудар быў выключан з камсамолу і з літаратурнай групы „Полымя“. Адной рукой творачы фальшывыя оды да дзесяцігодзьдзя Савецкай Беларусі, ён другой рукой распаўсюджваў супроцьсавецкія, шавіністычныя пасквілі. Клейнборт у „Прадмове“ ўзьнімае паэту Дудара на шчыт. Але мала таго—ганебную гісторыю з антысавецкімі пасквілямі ён выкладае так: **„Мінуў баявы пэрыяд; будні, савецкія будні ўступілі ў свае правы. І вось Дудар наступае на нейкія шыпы, якія раняць увесь лад яго гэраічнага рамантызму. Справа даходзіць да таго, што „Полымя“ выключае яго з свайго складу. Бедны Дудар, які наступіў на шыпы“!**

Здарэньне з альманахам „Резца“ прыцягнула нашу ўвагу па дзьвюх прычынах: папершае, клясава-варожыя пралетарыяту сілы, буржуазныя і дробна-буржуазныя нацыянал-дэмакраты ў шэрагу рэспублік ствараюць сваю агэнтуру ў расейскай літаратуры. Яны думаюць, што для іх расейска-савецка-друкарскі варштат будзе працаваць таксама, як працаваў у Жэневе і Лёндане варштат Герцэна *) і іншых расійскіх эмігрантаў.

Па-другое, відавочна, што наша пралетарская грамадзкасьць не заўсёды падыходзіць з правільным разуменьнем і патрэбнай увагай да нацыянальнай праблемы. У парадку самакрытыкі мы павінны сказаць, што зьяўленьне «невежественной» і няправільнай **) прадмовы Клейнборта ў альманаху „Резца“ можна тлумачыць толькі няўважлівасьцю рэдакцыі да літаратуры народаў СССР і да нацыянальнай праблемы. Вурок, атрыманы „Резцом“, зьяўляецца расплатай за яго няўважлівасьць да нацыянальнай праблемы ў пралетарскай літаратуры.

*) Параўнаньне няўдалае.—Рэд.

**) Ці толькі „невежественной“? Ці няма тут злой волі, пра'яўленьня варожай пралетарыяту ідэалёгіі?—Рэд.

*) Артыкул перадрукоўваецца з расейскай час. „На литературном посту“.

У КАПЦЮРОХ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ.

Палітыка сучаснай фашысцка-абшарніцка-капіталістычнай Польшчы ёсьць палітыка разьбіваньня рабоча-сялянскага адзінства. Прыдушыць радыкальную частку рабочых і бяднейшае сялянства жалезнымі лапамі крывавага тэрору, а больш падатную частку—багацейшую верхавіну — запрагчы ў фашысцкі воз праз розных сацыялдраднікаў, угадоўцаў і санатараў — задача сучаснай польскай палітыкі.

Усё гэта патрэбна фашыстам для таго, каб падрыхтаваць сабе з Заходняй Беларусі плядцарм для валўнічых захопніцкіх плянаў, мець надзейны тыл пры нападзе на СССР. Польскі капіталізм уступіў у фазу цяжкага і непапраўнага эканамічнага крызісу; польскаму фабрыканту патрэбны рынкі для збыту тавараў, абшарніку патрэбны пакінутыя ў БССР маёнткі, а ўсім ім разам, як і буржуазеі ўсяго сьвету, ненавісны і страшны рост магутнага будаўніцтва сацыялістычных рэспублік, вольных народаў СССР пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго авангарду—Камуністычнай партыі.

З гэтаю-ж мэтаю разьбіваюцца паліцыяй і сацыял-здраднікамі забастоўкі рабочых, душацца ўсе рабочыя, грамадзкія і прафсаюзныя арганізацыі, а самі ўдзельнікі гэтых арганізацый сурова прасьледуюцца. Белы тэрор і дзікая расправа з рабоча-сялянскімі масамі плянава ажыцьцяўляецца фашыстамі: так, яны разграмілі стотысячную арганізацыю — Грамаду і вынесьлі выключна суровыя катаржныя прыгаворы яе правадыром: Таранкевічу, Мятле, Рак-Міхайлоўскаму і інш. Разграмілі дваццацітысячную культурна-асьветніцкую арганізацыю Таварыства Беларускай Школы, сыстэматычна прасьледуюць Беларускі Рабоча-Сялянскі пасольскі клюб, якому ў сойме навіт не далі памяшканьня для канцэляры.

Паслы Беларускага Рабоча-Сялянскага клюбу не дапушчаюцца да галасаваньня ў сойме, ад іх ня прымаюцца прапановы і інтэрпэляцыі, а калі і прымаюцца, дык застаюцца бяз усякіх выпікаў.

Апрача гэтага, робіцца ўсё, каб не дапусьціць сялянска-работніцкіх паслоў да іх выбаршчыкаў—ні з жывым, ні з друкаваным словам. Дзеля гэтага падрад канфіскуецца беларуская радыкальная прэса, у якой час-ад-часу зьмяшчаліся пасольскія прамовы, скончылася гэта тым, што прэса зусім задушана.

Паслом не даюць дазволаў на справаздачныя мітынгі.

У Вільні арыштаваны пасол Грэцкі—у часе прамовы пры пахаваньні тав. Макоўскага; зьвязаному на руках і нагам Грэцкаму паліцыянт суне пад нос кулак са словамі: „усіх вас, беларусаў, выдушым“. Паслом Гаўрыліку і Валынцу ў Беластоку перад мітынгом **напушчаюць у залю ўдушлівых газаў**. Першага Мая ў Вільні наладжваюць крывавую бойню рабочым і паслу Дварчаніну; у Беластоку на народ і пасла Гаўрыліка пушчаюць конную атаку паліцыі. Разганяюць штыкамі мітынг пасла Валынца, у Рацэвічах паліцыянт стрэлам у галаву забівае селяніна Варановіча.

Пасла Крынчыка слонімскі стараста пазбаўляе выбарчага права пры выбарах у гмінную раду. У адказ на моцное жаданьне мясцовага жыхарства выбраць Крынчыка, стараста дае загад паліцыі арыштаваць пасла, а сход разагнаць штыкамі. Аднак, абураныя сяляне сілай адбіваюць арыштаванага пасла і гэты грозны адпор мас змушае самога ваяўнічага старасту ўцячы. Нарэшце, 12 ліпеня г. г. на мітынгу ў м. Карэлічах пасла Гаўрыліка зьбіваюць кольбамі, а Крынчуку перапрануты паліцыянт Паплаўскі страляе з рэвальвэра ў патылічу.

Але ня гледзячы на ўсе гэтыя гвалты, Беларускі Рабоча-Сялянскі Пасольскі клюб ня лічыць сябе ў праве здаць свае пазіцыі і вядзе ўпартую барацьбу за доступ да сялянска-работніцкіх масаў. Каб палегчыць гэтую задачу, клюб у некаторых паветах залажыў свае сэкратарыяты, якія разам з працуючымі ў іх сэкратарамі зарэгістраваны ў старостствах. Буржуазная польская прэса, усьцяж абліваючы беларускіх сялянска-рабочых паслоў брудам, як і станкевічаўскі „Пароб“, узьнялі трывогу, што адраджаецца новая „Грамада“, заклікаючы ўладу задушыць рух у зародку. Верная служка інтарэсаў буржуазеі, як роднай, так і замежнай, польская фашысцкая адміністрацыя палёкайскаму пасьпяшыла прыслужыцца панам капіталістам і абшарнікам. У выніку сыстэматычнага і яўнага тэрору разгромлен Беларускі Сялянска-Работніцкі Пасольскі клюб у Вільні, сэкратарыяты на паветах і арыштаваны навятовыя сэкратары, што мела месца 25 жніўня 1929 г.

У гэты дзень паслы Гаўрылік, Валынец, Грэцкі і Крынчык адбывалі чарговае пасяджэньне клюбу, запрасіўшы на яго навятовых сэкратароў, каб атрымаць ад іх справаздачы ў працы за мінулы час і даць параду на будучыню. А 7 гадзіне вечара ў памяшканьне клюбу, якое знаходзіцца ў кватэры пасла Грэцкага, уварвалася цэлая банда шпікоў на чале з падкамісарам тайнае паліцыі Васілеўскім і цэлы аддзел узброенай паліцыі мундуровай. Ня маючы на руках аніякага пісьмовага загаду і не зважаючы на пратэсты паслоў, паліцыя абшыла ўсе пакоі ў кватэры пасла Грэцкага, прычым сам Грэцкі, калі загароджваў сабою дзьверы, быў адпіхнуты кулаком у грудзі. Праглядзеўшы дакуманты прысутных, усіх арыштавалі выцягваючы сілай да аўтамабілю. Арыштавана 16 чалавек. Астапчык Мацей—сэкратар у Вільні, Пяткун—у Глыбокім, Таўпека—у Маладэчне, Шатоцкі—у Горадні, Астравецкі—у Баранавічах, Татарын—у Навагрудку, Пястра—у Косаве, Стэфановіч — у Ашмянах, Лычкевіч—у Слоніме, Сіняк—у Пінску, Махляр—у Паставах, трох працаўнікоў у сэкратарыяце—Міску, Тарасюка і Ігнатовіча і двух былых вучняў Віленскай беларускай гімназіі, якія выпадкова ўвайшлі ў памяшканьне ў часе вобыску.

Калі паслы на другі дзень зьвярнуліся на гэтай справе да пракурора, дык той сказаў, што ніякіх падстаў да абвінавачаньня арыштаваных не знаходзіць, і ўзьнімаць судовую справу супроць іх адмаўляецца, аб чым паведаміў ваяводу. Ня гледзячы на гэта, адміністрацыя адасланла арыштаваных у Лукішкі, і калі яны будуць выпушчаны невядома *).

А ў гэты час разбурваюцца кватэры арыштаваных сэкратароў—нагвалт шукаюць доказаў абвінавачваньня. Вядома, калі вобыскі робяцца з узломам, ды бяз прысутнасьці сьведак, гэтыя доказы могуць быць лёгка знойдзены, калі раней будуць падкінуты з кішэняў саміх рэвізораў. Ні інтэрвэнцыі паслоў у заяводах і судовых установаў, ні тэлеграмы да маршалка сойму не дапаглі. Усюды варожае маўчаньне, або панскія выкрунтасы. І ў гэтым няма нічога дзіўнага; было-б больш дзіўна, каб баранілі ад гвалтаў тыя, хто сам загадвае рабіць гвалты.

Вышэйпаказаныя факты яшчэ раз сьведчаць, што адносіны польскага фашызму да беларуска-сялянска-работніцкага вызваленчага руху пасьля разгону Грамады ня зьніжаліся; наадварот—наступ фашызму на сялян і рабочых узмацніўся. Зьмянілася толькі яго тактыка.

У гэтай барацьбе яскрава вызначыліся два супроцьлеглыя, незамірымыя лягеры,—лягер рэвалюцыі на чале з камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі і лягер контр-рэвалюцыі з беларускіх фашыстаў і ўрадоўцаў пад кіраўніцтвам польскага фашызму. Прадоўныя Заходняй Беларусі вытрымалі бліскучы палітычны экзамен і даказалі сваю клясавую сьвядомасьць. Яны далі рушучы адпор спробам фашыстаў тыпу Астроўскага-Лудкевіча сфашызаваць беларускі нацыянальны вызваленчы рух. Але праца па падрыхтоўцы да нападу на СССР ідзе поўным тэмпам, і беларускія фашысты не злажылі зброі, а толькі шукаюць новых мэтадаў барацьбы з нацыянальна-вызваленчым рухам.

Л. Г.

*) Правакацыя паліцыі настолькі была відавочнай, што пракуратура была прымушана звольніць усіх арыштаваных, якія прасядзелі да „разгляду справы“ звыш месяца, і якіх гарадзкі староста пасадзіў на 2 мес. ў астрог за „нелегальны сход“.

КААПЭРАЦЫЮ—ПАД КАНТРОЛЬ МАС

Толькі вычысьціўшы з апарату гандляроў і кулакоў, каапэрацыя ажыцьцёвіць свае задачы.

Яшчэ раз прачысьціць.

Чыстка каапэрацыйнага апарату ад усяго клясава чужога элемэнту шчыльна ўпірасцца ў праблему вылучэньня новага кадру каапэрацыйных працаўнікоў і побач з гэтым у неабходнасьць складаньня адпаведных умоў для працы вылучэнцаў.

Між тым, на сёньнешні дзень адзначаем шэраг момантаў бюракратызму і нават зьдзек у адносінах да нашых вылучэнцаў.

Вось цікавы і характэрны факт. В.-Далецкае сельска-гаспадарчае крэдытнае т-ва знаходзіцца ў эканамічна моцным сельсавеце, Вушацкага раёну.

У ліпені месяцы 1929 г., калі вытваралися перавыбары крэдытнага т-ва заможная частка разгарнула антысавецку працу.

Дзякуючы арганізаванасьці беднаты, батрацтва і серадняку праца кулацкай групіроўкі правалілася. Але праца групіроўкі на гэтым ня спынілася. Група ўзялася скампрамэтаваць вылучэнку Шэнкман і калгасьніцу, абраную ў склад праўленьня. Былога рахункавода Кірпіча накіравалі ў гор. Віцебск на курсы рахункаводаў, а на яго месца з Біржы Працы быў прынят нейкі Шаціхін. Старшыня праўленьня т. Лісіцын таксама быў камандыраван у Менск на курсы, а яго намесьнікам засталася Шэнкман. Шаціхін карыстаючыся момантам і нявопыт насьцю Шэнкман, заблытаў бухгальтэрыю і паведаміў сябру рэвізыйнай камісіі Сокалаву аб тым, што т. Шэнкман растраціла грамадзкія грошы. Тав. Шаціхін па сваёй ініцыятыве склікаў пасяджэньне праўленьня. На пасяджэньні быў утворан допыт Шэнкман, каб апошняя „прызналася ў растраце“. Гэта зрабіла рэвізійная камісія замест таго, каб дапамагчы распутаць заблытанасьць Шаціхіна.

Сябра рэвізійнай камісіі Сокалаў падпісаў не праверыўшы акт. Рэвізіяй, вытвараная інспэктарам сельсаюзу і сельбанку, высьветлена што ніякай растраты ня было. „Растрату“ Шэнкман скарыстала заможна-кулацкая частка для антысэміцкіх мэт і кампрамэтацыі яўрэйскіх калгасаў, адкуль абрана Шэнкман.

Аб Шаціхіну. У мінулым—ён афіцэр, судзім за ўзятку, як чалавек „вопытны“ хутка ўзяў арыентыроўку «на сваіх». Сокалаў настаўнік, не жадаў абвастраць супроць сябе заможна-кулацкую верхавіну вёскі, бо ў Мала-Далецкім сельсавеце жыве яго бацька, які мае моцную гаспадарку.

Што-ж датычыцца Кабякі, дык ён раней прэтэндаваў на месца Шэнкман. Між іншым у час рэвізіі знойдзен лішак па краме за т. Кабяка 272 р. 86 кап. Пры чым такі выпадак за ім заўважваўся і раней у бытнасьць яго на працы ў Кубліцкім таварыстве.

Старшыню праўленьня Лісіцына, які прайшоў чыстку партыі, у мінулым чырвоны партызан, батрак, карыстаецца аўтарытэтам сярод беднаты,—пастанавіла зьняць з працы, а Шаціхіна і інш. пакінуць на мейсцы. Чым гэта тлумачыцца, магчыма тым, што сябры камісіі па чыстцы апарату харчаваліся ў Шаціхіна і папалі пад яго ўплыў. Гэта справа патрабуе яшчэ раз пачысьціць апарат і выкарчаваць з карэньнямі антысавецкіх элемэнтаў з установы.

Анучын Пятрок

г. Полацак. 20-IX-29 г.

За каапэрацыйкыя грошы.

Няма таго вечара, каб загадчык крамы, што працуе ў Даманавіцкім спажывецкім т-ве, абыйшоўся бяз гульні ў карты і з грашыма хлопец спрытны, што вечару цягне туза. Сваю любімую гульню ён устрайвае на кватэры ў былога гандляра, цяпер таксама служачага с.-г. каапэрацыі, кантара. Ці ня ведае хто, чые там грошы разыгрываюцца?

Нам здасцца, што крамныя, бо на пэнсію ня вельмі разгуляецца.

Падбярэзны і Золкі.

Новая вынаходка.

Прыказчык Лапаніцкага аддзяленьня Пранойскага спажывецкага таварыства надта шчыра ўзяўся за культурную рэвалюцыю. Першы націск ён зрабіў на драматычную справу, і вось зьвязаўся з драматычным гуртком і парашыў, што кожны спажывец павінен наведваць і тэатр.

Зараз, калі хто прыдзе ў краму што-небудзь купіць ён павінен абавязкова ўзяць білет на спэктакль. Калі хто адмовіцца, яго зараз прыказчык адносіць да некультурных і даказвае, што такім няма мейсца і ў водпуску тавараў адмаўляе.

Нішто сабе мэтад,—кажуць сяляне—хочаш—ня хочаш, а ў тэатр ідзі.

Пайнік.

Хто вычысьціць Раманенка.

У Радускім спажывецкім т-ве (Жлобінскі р., Бабруйшчына) працуе загадчыкам крамы гр-н Раманенка А. Яго бацька мае моцную гаспадарку і абкладаецца падаткам у індывідуальным парадку. Каб завахаць свой кулацкі твар, Раманенка А. утварыў фікцыйны надзел маемасьці і цяпер нібыта жыве паасобна ад бацькоў.

Во як кулакі ўмеюць прымайстроўвацца да дзяржапарату.

Ці не пара аслабаніць мейсца ад такога дагадчыка крамы?

Яўхім Я.

Ня крама, а „лавачка“.

„Разумней“ ад якаўлевіцкіх каапэратараў, мусіць, ніхто і ня прыдумае. З мэтай утаненьня каштоўнасьці гандлёвага апарату праўленьне т-ва прыняло на працу ў якасьці загадчыка крамы нясабра саюзу, былога гандляра Стамблера. Дык вось гэты самы Стамблер „варочае справамі“ адтрымаўшы краму. Цяпер наша каапэрацыйная крама стала сапраўднай Стамблераўскай „лавачкай“: бацька ўзяў да сябе ў краму дачку і сына і як кажуць па-тутэйшаму, „гандлюць сямейкаю“.

Таварышы з РСІ, заглянсце, калі ласка, да якаўлевіцкіх каапэратараў.

М. Г.

Ударым па руках шкоднікаў сацыялістычнага будаўніцтва!

КАПЫЛЬСКІ ПАМПРАКУРОРА РАТНЭР ПАТУРАЕ КУЛАКАМ.—КУЛАЧЧО ПАДПАЛЬВАЕ ГАСПАДАРКІ КАЛГАСЬНІКАЎ. —ДАМО АДПОР КУЛАЦКАМУ ТЭРОРУ.

Беднота за калгасы.

Яшчэ тыдні за 2 да дню калектывізацыі ў Капыльскім райёне шырока разгарнулася праца па ўцягненьню сялянскай беднаты і серадняцтва ў калгасы. Праўду кажучы, дык нават і асаблівай працы ня трэба было разгортваць, бо беднота і лепшая частка серадняцтва самі добра зразумелі, што калектывізацыя—гэта адзіны шлях да падняцьця сельскай гаспадаркі, да палепшаньня дабрабыту самога працоўнага сялянства. Вось чаму ў шэрагу вёсак райёну знаходзілася ініцыятыўная група сялян, якія заяўлялі аб сваім жаданьні арганізавацца ў калектыў. Да гэтых груп далучаліся дзесяткі і часам шмат дзесяткаў сялянскай беднаты і серадняку, якія таксама заяўлялі, што яны жадаюць разам з ініцыятарамі арганізаваць калгас.

Кулакі ня сьпяць.

Але кулаччо і іх прысьпешнікі таксама ня спалі, яны ўсялякімі спосабамі разгортвалі сваю шкодную кампанію, карыстаючыся мэтадамі застрашваньня і нават ня спыняючыся перад мэтадам тэрору.

Возьмем вёску Доктаровічы; пасьля правядзеньня адпаведнай працы сярод бедняцка-серадняцкіх мас працаўнікоў райёну 30 гаспадарак выказалі шчырае жаданьне арганізавацца ў калгас. Нават у гэту вёску быў ужо камандыраван каморнік для правядзеньня земляўпарадкаваньня калгасу, ён ужо пачаў праводзіць сваю працу. Але ў гэты час мясцовае кулаччо таксама вяло агітацыю, яно ўсялякімі спосабамі спрабавала зрабіць уплыў на беднату: вось, мол, прыдуць памешчыкі, яны вам пакажуць калгас; ня спыняліся нават і перад тым, каб намякнуць аб чырвоных неўнях, якія часам гуляюць па калгасах. У выніках такой „агітацыі“ сялянская беднота катэгарычна адмовілася арганізавацца ў калгас і каморніка прышлося перакінуць у в. Кіевічы.

А ўсё-ж калгасы растуць.

У вёсцы Кіевічы яшчэ да дню калектывізацыі 15 гаспадарак выказалі жаданьне арганізавацца ў калгас. Калі-ж да іх прыехаў каморнік, дык у дзень калектывізацыі колькасьць жадаючых папасьці ў калгас вырасла да 48 гаспадарак. Калгас арганізован і сяляне з вялікім уздымам, з сьпевамі выйшлі на поле засяваць па новаму,—узораны ўсе межы і сяўба праведзена калектывам.

Спрабавалі заможнікі і тут разгарнуць сваю агітацыю, але з яе нічога ня вышла—новы калгас з 48 гаспадарак—факт.

У актыў калгаснага руху па Капыльскаму райёну ўнесены багатыя ўклады: у «Дзень калектывізацыі» ўся вёска Кабыльшчыцы з 44 гаспадарак арганізавалася ў калгас „Сталінец“ і засеў зрабіла ўжо па новаму—калектыўнаму; да былога калгасу Абрамовіч, які складаўся з 8 гаспадарак, далучылася ўся вёска Усова (63 гаспадаркі) і арганізован новы калгас „Ленінец“.

Да калгасу „Тружэнік“ далучылася 30 гаспадарак з вёскі Печураны з сваёй зямлёй. Усе гэтыя калгасы аформлены і васеньню сяўбу ўжо праводзілі калектывамі, узорваючы ўсе існаваўшыя межы.

Клясавая барацьба.

Што ня ўсюды арганізацыя калгасаў праходзіла ў больш-менш спакойных умовах, мы ўжо бачылі па прыкладу в. Дактаровічы.

Прыкладам-жа самай вострай клясавай барацьбы можа служыць вёска Евангелевічы, тут ужо справа дайшла нават і да тэрору, але аб гэтым крыху пазьней.

Вёска Евангелевічы складаецца з 186 гаспадарак. Пасьля шэрагу выездаў у Евангелевічы райённых працаўнікоў і адпаведнай тлумачальнай працы з 186 гаспадарак у калгас запісалася 160. Сяляне ўвайшлі ў калгас, па агульным сходзе абгаварылі і падпісалі ўстаў, нават выйшлі ў поле працаваць—па-новаму засяваць зямлю. Хтось пусьціў чуткі, што кулакам дадуць зямлю ў другім месцы, а іх аддадуць калгасу. Надыйшла нядзеля, група кулачкоў накіравалася ў райвыканком за тлумачэньнем, але ні старшыні РВК, ні загадчыка райземчасткі ў гэты час у райвыканкоме ня было.

Тады група „беднячкоў“ накіроўваюцца да пам. пракурора т. Ратнер.

Аб чым і што гаварылі заможнікі з пампракурорам, якія нарады даваў ім апошні,—можна толькі рабіць дагадкі. Нам вядома толькі адно, што пасьля „рандэву“ з т. Ратнер, кулачкі вярнуліся да сябе з паднятай галавой і пачалі бузіць у вёсцы, пагражаць беднаце і сераднякам прыходам памешчыкаў і бізуном апошніх. Адным чынам клясавая барацьба прыняла вельмі вострыя формы.

Трэба сказаць, што застрэльшчыкам арганізацыі калгасу ў в. Евангелічах быў старшыня сельсавету, які таксама ўвайшоў у калгас і нават з групай новых калгасьнікаў старшыня сельсавету пасьпеў прывезьці да 300 пуд. насеньня. Насеньне злажылі ў пуні і калгасьнікі, непакоячыся помстай з боку кулацтва, наладзілі каля пуні варту.

...Скончылася кулацкім тэрорам.

Бойка паміж калгасьнікамі і кулаччом разгарнулася, кампанія апошніх рабіла на больш слабых духам уплыў і некаторыя беднякі з серадняками пачалі заяўляць аб выхадзе з калгасу. Прыйшлося схаць у райён, адкуль прывезьлі старшыню РВК наладзілі сход, які праходзіў вельмі гарача. Досыць сказаць, што сход зацягнуўся да чацьвертай гадзіны раніцы. Урэшце канчаткова згадзілася пайсьці ў калгас каля 100 гаспадарак.

Разышліся па хатах, вёска пасьля бурнай ночы заснула, але ня спалі ворагі калектывізацыі, ня спалі ворагі савецкага ладу і а 5-й гадзіне раніцы заснуўшая вёска была разбуджана крыкамі „пажар“, „пажар“.

Кулаччо ведала што рабіла, яно ведала каму пусьціць чырвонага пеўня; гарэла гаспадарка застрэльшчыка арганізацыі калгасу—старшыні сельсавету.

Пажар хутка ліквідавалі, але сярод натоўпу сялян раздавался галасы: «вось што кулакі робяць з калектывістамі, тое будзе і з намі“... У выніках у калгасе засталося толькі 48 гаспадарак.

А пампракурора супроць тэрору?

Усім больш чым відавочна было што пажар—вынік кулацкага наступу на калектывізацыю вёскі, што гэта помста вясковаму энтузыясту ў справе ажыцьцяўленьня пастаноў X

14 КАСТРЫЧНІКА— „ДЗЕНЬ УРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ“

МАБІЛІЗУЕМ ШЫРОКІЯ МАСЫ ПРАЦОЎНЫХ ВАКОЛ ЗАДАЧ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ СЬВЯТА ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

У Полаччыне дзякуючы недбайласьці выстаўкомаў зрываюцца сельска-гаспадарчыя выстаўкі.

У СПРАВЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ ВЫСТАЎКІ ПАНУЕ СТЫХІЯ: НЯМА ПЛЯНАВАСЬЦІ, КІРАЎНІЦТВА І РАБОЧАГА КАНТРОЛЮ.

Максымум увагі сацыялістычнай перабудове вёскі.

Верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б па пытаньню разьвіцьця сельскай гаспадаркі даў поўны і сталы напрамак. У настанове па дакладу аб выніках савгаспнага і калгаснага будаўніцтва і далейшых задачах гаворыцца: „Сучаснае становішча сельскай гаспадаркі Беларусі, асабліва хутарызацыя яе ў мінулым, патрабуе ад усіх партыйных, савецкіх і кааперацыйных арганізацый значна больш напружанага тэмпу калгаснага будаўніцтва, шырока разгортваючы працу па далейшай арганізацыі новых буйных калгасаў, ахапляючы калектывізацыяй цэлыя вёскі, сельскія саветы і райёны, узбуйняючы і ўмацоўваючы існуючыя калгасы“. Пленум даў дырэктыву, каб абагулены сэктар сельскай гаспадаркі да канца 1930 году займаў 13 проц. усёй засеўнай плошчы.

Узмацненьне тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва, больш рашучы наступ на капіталістычныя элементы, а таксама шырокі калгасны рух, які ў сучасны момант разгортваецца сярод значнай часткі бядняцка-серадняцкага сялянства патрабуюць перагляду плянавых мерапрыемстваў нядаўніх ў галіне аграмаджаньня індывідуальных сялянскіх гаспадарак у бок значнага павялічэньня лічбовых паказальнікаў. Гэта задача, разам з задачамі ўзьнімцьця ўраджайнасьці, тавернасьці, рэнтабельнасьці сельскай гаспадаркі зьяўляюцца асноўнымі, на вырашэньні якіх павінна быць згуртавана ўвага ўсёй савецкай грамадзкасьці.

14 кастрычніка мы будзем праводзіць «Дзень ураджаю і калектывізацыі». Ва ўчаранішнім нумары нашай газэты зьмешчана праграма падрыхтоўкі і правядзеньня «Дню ўраджаю і калектывізацыі». У гэты дзень мы павінны будзем падвесьці вынікі працы нашай за год і завастрыць увагу рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства на бліжэйшых задачах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

З комплексу ўсіх пытаньняў, якія намечаны праграмаю і якія зьяўляюцца абавязковымі для правядзеньня, мы лічым неабходным выпукліць асабліва некаторыя, на якіх галоўным чынам павінна быць згуртавана ўвага ўсёй савецкай грамадзкасьці. Перш за ўсё трэба памятаць, што сьвята „Дзень ураджаю і калектывізацыі“ павінна быць масавым сьвятам ня толькі працоўных вёскі, але і гораду. Вось чаму неабходна загадзя правесьці падрыхтоўчую працу, каб мабілізаваць увагу шырокіх працоўных мас вакол тых лозунгаў і практычных задач, якія высоўваюцца ў „Дзень ураджаю і калектывізацыі“.

Максымум увагі калектывізацыі і ў першую чаргу тым раёнам, дзе праводзіцца масавая, агульная калектывізацыя—вось на чым трэба зрабіць упор. Трэба правесьці шырокую палітычную растлумачальную працу аб шкодлівасьці хутарызацыі сельскай гаспадаркі. Трэба зрабіць каранны пералом у справе аграмаджаньня сельскай гаспадаркі ў тых раёнах, дзе хутарская сыстэма яшчэ пануе. Сельска-гаспадарчыя выстаўкі асабліва павінны выпукліць дасягненьні аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі, каб наглядна паказаць селяніну бедняку і серадняку індывідуальную перавагу калектыўных спосабаў гаспадараньня. Трэба адзначыць, што за апошні год працы нашага аграмаджанага сэктару гаспадаркі ёсьць што паказаць.

Адным з самых значных недахватаў у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній у вёсцы зьяўляецца тое, што гарадзкія арганізацыі як прафсаюзы, пэфтаварыства і інш., недастаткова прымаюць удзел у гэтых кампаніях. У гэтым напрамку неабходна зрабіць каранны пералом. Сьвята „Дзень ураджаю і калектывізацыі“ павінна быць сьвятам усіх працоўных. Прафсаюзам, пэфтаварыствам трэба разгарнуць шырокую і глыбокую працу па дапамозе вёсцы ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Што ў першую чаргу патрабуецца ад прафсаюзаў? Ёсьць рапэньне адпаведных органаў аб утварэньні Пралетарскага т-ва садзейнічаньня калектывізацыі. Гэта т-ва павінна будзе ўсямерна дапамагаць разьвіцьцю калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ім патрэбна будзе абхапіць максымум працоўных гораду. Працу па ўтварэньню т-ва садзейнічаньня калектывізацыі трэба зараз-жа шырока разгарнуць на прадпрыемствах—фабрыках і заводах і ва ўстановах. Т-ва садзейнічаньня калектывізацыі будзе адною з лепшых форм сувязі працоўных гораду з бядняцка-серадняцкім сялянствам. Гэта т-ва, акрамя ўсяго іншага, дасьць хоць і невялікія сродкі для ўзмацненьня працы на калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Другое пытаньне, надзвычайна важнае—гэта збор сродкаў на ўтварэньне трактарнай калёны ці станцыі імя БССР. У вёсцы для збору сродкаў трэба арганізаваць суботнікі і іншыя мерапрыемствы, у горадзе асабліва шырока павінна быць разьвіта праца ў гэтым напрамку, каб максымум сабраць сродкаў. Збор сродкаў ня толькі самаката, але і важнае палітычнае мерапрыемства, на якім мы павінны завастрыць увагу працаўных мас гораду і вёскі.

У „Дзень ураджаю і калектывізацыі“ павінна будзе быць праведзена закладка прыгарадных калектыўных і савгаспадарак. Мэтавая ўстаноўка гэтых гаспадарак—даць гарадом неабходную гародніну. Магчымасьці арганізацыі такіх гаспадарак ёсьць. Мы каля вялікіх гарадоў маем значныя плошчы засеяныя зернавымі культурамі, што, зразумела, менш дае карысьці, чымся спэцыяльны ўхіл культывіраваньня гародніны, у чым адчуваецца недахват. Менск, Віцебск, Гомель, Бабруйск асабліва павінны разгарнуць працу ў гэтым напрамку.

На чым яшчэ трэба асабліва згуртаваць увагу ў „Дзень ураджаю і калектывізацыі“? Масавая праверка правядзеньня аграмінімуму, праверка выкананьня дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву і кантрактацыі, па каапераваньню беднаты—вось надзвычайна важныя пытаньні, якія яскрава павінны быць выпуклены ў дзень сьвята. Трэба мець на ўвазе, што ў нас яшчэ шмат недахватаў у працы. Вось, напрыклад, Менскае акруговае малочнае т-ва не скарыстала пяць тысяч руб. на каапераваньне беднаты.

Як у падрыхтоўчай працы, так і ў час правядзеньня сьвята «Дню ўраджаю і калектывізацыі» мы не павінны выпусьціць з-пад увагі і такія пытаньні, як ліквідацыю няпісьменнасьці сярод калгасьнікаў і рабочых савгасаў, пераход працы трактараў на непрарыўны тыдзень, разгортваньне культурнай працы і хімізацыю сельскай гаспадаркі. Саюз працасьветы разам з органамі Наркамасьветы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці павінны зрабіць усё магчымае, каб у самы бліжэйшы час ліквідаваць няпісьменнасьць сярод рабочых мас савгасаў і калгасьнікаў. Саюз Рабземлесу павінен распрацаваць мерапрыемствы аб пераходзе на непрарыўны тыдзень працы трактараў. Саюз бязбожнікаў, асоавіахім павінны правесьці адпаведную працу на сваёй лініі.

Згуртаваньне ўвагі ўсёй савецкай грамадзкасьці вакол сьвята «Дню ўраджаю і калектывізацыі» дасьць належныя вынікі.

Я. Мацюкевіч.

ФАКТЫ СЫГНАЛІЗУЮЦЬ.

У цішы габінэтна-бюракратычнага павуціньня рыхтуюцца да ўсебеларускай с.-г. выстаўкі.

Няма плянавасьці, няма належнага кіраўніцтва.

Яшчэ нядаўна на старонках нашай газэты адзначалася, што падрыхтоўка да ўсебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўкі праходзіць вельмі слаба, што ў плянах ёсьць шэраг буйных недахопаў.

Матар'ялы, якія ёсьць у нас зараз яшчэ больш гавораць аб фактах бясплянавасьці і бяссыстэмнасьці ў падрыхтоўцы да выстаўкі.

„Працуюць пастолькі-паколькі“...

Загадчыкі аддзелаў—гэта цэнтр усяе працы. Ад іх актыўнасьці залежыць пасьпяховасьць падрыхтоўкі, а між тым многія сваёй працай не зацікаўлены, працуюць так, каб хутчэй адчапіцца. Вельмі часта ад загадчыкаў можна чуць заўвагі гэткага зьместу:

— „Калі-б нам давалі больш грошай, працавалі-б лепш; грошай мала даюць, а таму будзем працаваць пастолькі-паколькі“...

На чале аднаго з галоўных аддзелаў—мэханізацыі і электрафікацыі сельскай гаспадаркі—стаіць прафэсар Взйс, а памоснікам яго зьяўляецца інжынэр Вансецкі. Падрыхтоўчая праца ў гэтым аддзеле праходзіць вельмі нарудна, бо т. Взйс нічога ня робіць, а тав. Вансецкі нават не электра-тэхнік і ня ведае, якія машыны трэба закупляць. Кіраўнікі гэтага-ж аддзелу таксама амаль ні разу не сабраліся для абгаварэньня пытаньняў сваёй працы. Кожны спадзяецца, што хтосьці дзесьці робіць, а між тым усё стаіць на мёртвым пункце...

З гэткім-жа „энтузіязмам“ працуюць і заг. іншых аддзелаў. Так, заг. аддзелам мэліярацыі ні разу нават ня быў на тэрыторыі выстаўкі.

Балотна-выставачны камітэт склікаўся некалькі разоў, але на пасяджэньні зьяўляецца звычайна толькі 15 проц. членаў.

Па лясному сэктару нічога ня робіцца. Кіраўнік аддзелу проф. Мельнік яшчэ не прадставіў плянаў... Заг. лясным пададдзелам таксама такас адзінкуль загадаў.

Выстаўка часткова будуецца, а кіраўнікі аддзелаў сядаць у іншых гарадох і пасылаюць папяровыя інструкцыі, якія ў многіх выпадках не адпавядаюць сваёй мэтавай устаноўцы.

Слана і не заўважылі.

У цішы габінэтна-бюракратычнага павуціньня ідзе падрыхтоўка да выстаўкі. Пляны будуюцца, але... без рабочага кантролю, бяз шырокага абгаварэньня на рабочых сходах.

У выніку—адсутнічае на выстаўцы аддзел калектывізацыі, які ў сучасны момант—пры рэканструкцыі сельскай гаспадаркі адыгрывае асаблівую ролю. Як ні дзіўна, а на ўсебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўцы ня будзе паказан шлях сацыялістычнай перабудовы вёскі, ня будзе калгасу.

Між тым шмат разоў спэцыялісты Менску выказваліся за пабудову на тэрыторыі выстаўкі паказальнага калгасу. Гэта думка загразла недзе ў канцылярскіх нетрах...

Толькі зараз Белкалгассаюз думае побач з тэрыторыяй выстаўкі пабудаваць калгас.

І яшчэ адзін характэрны момант. Выстаўка зусім не адбівае пытаньня зямляўпарадкаваньня нацыянальных меншасьцяў. У Беларусі пасьля Кастрычніка зямляўпарадкавана 60-70 тысяч яўрэйскіх сем'яў, мы маем 20 яўрэйскіх калгасаў. Ці адбіваецца гэта ў плянах выстаўкі?

Не!

Такія арганізацыі як „Озет“ і «Орт» нават ня ведаюць, што ідзе падрыхтоўка да сельска-гасп. выстаўкі.

Выстаўка таксама слаба адбівае гістарычныя, прыродныя ўмовы і асаблівасьці Беларусі.

На выстаўцы адсутнічае аддзел індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, ня гледзячы на тое, што неаднакроць гаварыцася аб гэтым на сходах спэцыялістаў.

Блытаніна.

На мясцох праводзіцца падрыхтоўка да выстаўкі, і адначасова акругі блытаюцца—ня ведаюць, як будзе праходзіць выстаўка, ня ведаюць, ці будуць прадстаўлены асобныя акругі.

У адным месцы плянуе гаворыцца аб тым, што акругі будуць прадстаўлены асобна, а далей, што экспанаты будуць прадстаўлены наогул...

Беларусь мае шмат розных раёнаў; трэба было выстаўку разьмеркаваць па іх асаблівасьцях.

Выстаўка нават у падрыхтоўчай працы ужо мае шэраг арганізацыйных няўвязак. Шмат якія установы рыхтуюць экспанаты і ня ведаюць, ці будуць яны прадстаўлены. Так, Менсельпром падрыхтаваў вінны завод але ніхто ня ведае, ці будзе ён прадстаўлен на выстаўцы.

Яшчэ на сягонешні дзень не ўпарадкавана пытаньне аб адносінах да экскурсантаў. Пытаньне аб пабудове сталоўкі на тэрыторыі выстаўкі ўсё яшчэ вырашаецца... Гэтаксама нічога ня робіцца і ў адносінах агульнага памяшканьня для сялян—удзельнікаў выстаўкі і хадакоў.

Нельга прайсьці міма таго факту, што лясны сэктар ня мае свайго адбіцьця. Гэты сэктар павінен паказаць лесаўпарадкаваньне, лесакультуру, дасьледчую працу і аховы лесу. Гэтага ня відаць. Усё паказана вельмі туманна.

Хто кіруе выстаўкай?

Гэта бяссыстэмнасьць і бясплянавасьць зьяўляецца перш усяго вынікам здсутнасьці належнага кіраўніцтва як з боку выставачнага камітэту, так і з боку НКЗ Беларусі.

Яшчэ зусім нядаўна прадстаўнік НКЗБ т. Міхайлаў па сходзе спэцыялістаў даў наступную ацэнку «праробленай» працы:

„Нагэтаму я лічу, што аб тым, што практычна зроблена на лініі НКЗему, гаварыць зараз ня прыходзіцца“.

Выставачны камітэт таксама нічога ня скажа, бо ён спадзяецца на НКЗ...

Дамо слова у тэрміновым парадку НКРСІ Беларусі.

Маз.

Зрываюцца сельска-гаспадарчыя выстаўкі ў Полаччыне.

Адбыўшаяся нарада 12-га верасьня, дзе была заслухана інфармацыя раённых выстаўкомаў аб ходзе падрыхтоўкі да раённых сельска-гаспадарчых выставак, а таксана і ўсебеларускай паказала, што на Полаччыне нічога ня зроблена ў справе падрыхтоўкі.

Інфармацыя паказала, што раённыя выстаўкомы [пайшлі па шляху Акруговага, члены якога, за выключэньнем аднаго загадчыка Акрэа, ня лічаць нават патрэбным быць хоць-бы на адным пасяджэньні, бо [illegible] зьяўляюцца адказнымі працаўнікамі і такімі справамі ня маюць часу займацца. Працуе, не, лянёй засядае загадчык Акрэа з некалькімі спэцыялістамі.

Ня гледзячы на тое, што да раённых выставак засталося толькі 10 дзён, нічога ня зроблена, акрамя некалькіх пасяджэньняў, складаньня і перасклаканьня плянаў і дачы дырэктыў сельсаветам і калгасам. Канкрэтнай працы па разгортваньню падрыхтоўкі па стварэньню належнай грамадзкай думкі сярод спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, а таксана насельніцтва і прыцягненьню наогул грамадзкасьці, па растлумачэньню сярод масы задач і мэт выстаўкі зусім няма. Ніякай праверкі, што зроблена ў сельсаветах, што робіцца ў калгасах не вядзецца.

Акруговы плян быў складзен з спазьненьнем і ў раёнах пачалі складаць свае пляны без акруговых, далей плянаў не пайшлі. Падрыхтоўкі экспанатаў для выпукленьня акругі, як ільнаводнай, а таксама выяўленьня, як у акрузе з вялікай колькасьцю вазёр, водных багацьцяў, выяўленьне ўсіх іншых прыродных асаблівасьцяў і г. д. ва ўсім гэтым нічога ня зроблена. Цэлы шэраг экспанатаў, асабліва на расьлінаводству, якія зараз павінны быць выбраны на раённых с-гаспадарчых выстаўках для ўсебеларускай на тэй прычыне, што ў будучым годзе да адчыненьня выстаўкі ў лініі месяцы іх вельга яшчэ будзе падрыхтаваць, зусім ня вылічэн, ня зроблена належнай падрыхтоўкі па іх дбору і г. д. Зарэгістравана толькі ўсяго некалькі экспанатаў у Вульскім раёне для раённай выстаўкі, а ў іншых нічога няма. Выстаўкомы друкуюць і пасылаюць інструкцыі і дырэктывы і чакаюць... дню адчыненьня выставак. Арганізацыі і падпітурхоўваюць гэтай справы у сельсаветах, калгасах, савгасах і інш. няма.

Патрэбен рашучы пералом у працы выстаўкомаў, як раённых, так і акруговых з тым, каб хоць што небудзь зрабіць за той кароткі час, які застаўся да раённых выставак, так і асабліва на адбору экспанатаў да ўсебеларускай выстаўкі, інакш Полацкая акруга амаль зусім будзе адсутнічаць на ўсебеларускай выстаўцы.

К.

Рыхтуемся да „Дню ўраджаю і калектывізацыі“

Праца па падрыхтоўцы да „Дню ўраджаю і калектывізацыі“ распачалася ў нас 20 жніўня. Увесь райённы актыў накіраван па вёсках і сельсаветах дзеля правядзеньня растлумачальнай працы і практычнай дапамогі сельсаветам у падрыхтоўчай працы.

Галоўнымі задачамі правядзеньня дню калектывізацыі на райёну зьяўляюцца ўзбуйненьне старых калгасаў, шляхам уцягненьня ў іх новых членаў і арганізацыя новых буйных калгасаў, арганізацыя і ўзбуйненьне кааперацыйных аб'яднаньняў, далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі, вёскамі і кааперацыйнымі аб'яднаньнямі, выкананьне аграмінімуму, датэрміновая здача сельгаспадарчага падатку, распаўсюджваньне 3-й пазыкі індустрыялізацыі і інш.

На асобных сельсаветах распрацованы заданьні; уцягнуць ня менш 5 членаў у калгасы, арганізаваць на аднаму буйнаму калгасу ў кожным сельсавеце, уцягнуць у крэдытнае т-ва 15 новых членаў, заключыць умовы на сацыялістычнае спаборніцтва, датэрмінова здаць с.-г. падатку 500 р., хлебных лішкаў ня менш 100 пудоў, рэалізаваць па кожнаму сельсавету 3-й пазыкі індустрыялізацыі на 500 р. Арганізацыя па сельсаветах экскурсій сялян у калгасы, савгасы і кааперацыйных аб'яднаньні.

Парт. і камсамольскія арганізацыі паставілі перад сваімі членамі задачу, каб пасьля правядзеньня «дню калектывізацыі» ня было ніводнага партыйца і камсамольца не ўвайшоўшага ў калгас ці кааперацыйнае аб'яднаньне.

(Круглянскі раён, Аршаншчына). Міх. Д-ў.

Пазыку індустрыялізацыі— у масы.

Пазыку індустрыялізацыі прасоўваем у вёску.

(Смалявіцкі раён, Меншчына)

На Смалявіцкі раён вызначана рэалізаваць 3-ю пазыку індустрыялізацыі 31.300 руб.

Пасьля атрыманьня дырэктыў і матар'ялу, РВК склікаў пашыраны пленум РВК з удзелам с-с. і актыву вёскі дзе стаяла пытаньня аб распаўсюджваньні пазыкі ў с-с.

Пасьля пленума РВК пытаньне гэта было перанесена на пленумы с-с., якія вылучылі контр-агентаў і актыў.

Бяднякі і сераднякі адгукнуліся на заклік камуністычнай партыі і савецкай улады і падпісваюцца на пазыку.

Заможная і варожая частка агітуе супроць пазыкі.

У дапамогу с-с. саюзы арганізавалі рабочыя брыгады, якія выезджаюць у с-саветы. З дапамогай партыйных і савецкіх органаў пасьпяхова праводзіцца кампанія па рэалізацыі пазыкі У вёсцы Антанопаль і другіх усе гаспадары падпісаліся на меншы чым на 5 руб. і выклікалі на спаборніцтва суседнюю вёску.

Некаторыя с-с. як напрыклад юраўскі рэалізаваў 150 проц. дадзенай яму сумы.

На 1 верасьня сярод сялян рэалізавана 18.675 руб.

Саюзы за выключэньня працасьветы падпісаліся на 110 пр. атрымоўваемай зарплаты.

Мясцкому саюзу працасьветы—трэба падцягнуцца.

„Язэп Чаромуха“

Беднота і сераднякі ў падпісцы першымі.

(Капыльскі м-савет, Меншчына).

На Капыльскі местсавет вызначана заданьня рэалізаваць 3-й пазыкі індустрыялізацыі на суму тры тысячы 500 руб.

Праведзена растлумачальная праца сярод сялянства. У першую чаргу сталі дакład на пленуме м-савету, дзе ў першую чаргу ўхвалілі падпісацца ўсім членам і кандыдатам м-савету, што ўжо і зроблена.

Там-жа разьмеркавалі ўсе сілы для абходу сялянскіх двароў. І як факт—абход двароў дае вельмі добрыя вынікі. Адзін раён (вуліца) падпісаўся на суму больш 300 рублёў, не адстаюць і іншыя раёны, якіх у мястэчку пяць.

Калі па аднаго актыўнага бедняка-ўзлажылі адказнасьць за абход свае вуліцы, ён паклікаў на дапамогу настаўніка Салаўя, які на прапанову: „хадзем рабіць абход, ты-ж у гэтай групе“, адказаў гэтаму селяніну:— „твае словы ў вадно вуха ўваходзяць, а праз другое выходзяць“. Вось як настаўнік дапамог актывісту-селяніну.

На сёньняшні дзень па Капыльскаму м-сав. рэалізавана пазыкі больш чым на тысячу 150 рублёў.

Странок.

Аршаншчына адстае.

Праца па рэалізацыі трэцяй пазыкі індустрыялізацыі сярод рабочых і служачых на Аршанскай акрузе праводзіцца нездавальняюча, а сярод сялянства і зусім дрэнна.

Для прыкладу застанаўлюся на некаторых раёнах. Па Расьнянскаму заданьне выкананa на 12,7 проц., сярод сялянства—1,60 проц., Коханаўскаму 21,5 проц., з гэтай сумы 4,37 проц. сярод сялянства, Дрыбінскаму—30,40 проц., сярод сялянства—5,71 проц., і Мсьціслаўскаму—30,8 проц. (наогул), а сярод сялянства—19,87 проц.

Вось гэтыя кароценькія факты і лічбы паказаныя ў вранцатных адносінах да заданьняў і сьведчаць аб тым, што на Аршаншчыне дрэнна абстаіць справа з распаўсюджаньнем пазыкі, што райвыканкомы і гарадзкія саветы ня прынялі належных мер да пасьпяховага распаўсюджаньня пазыкі і асабліва сярод сялянства.

Хаця акрфінаддзел і паслаў сваіх адказных працаўнікоў у райёны для праверкі ходу падпіскі і дапамогі РВК у правядзеньні гэтай кампаніі, але-ж адны прадстаўнікі фінаддзелу, без актыўнай дапамогі мясцовых органаў, у тым ліку партыйных, прафэсыйных і камсамольскіх, ня змогуць выканаць на ўсе 100 проц. плянавыя заданьні.

С. Лодысеў.

Павольным тэмпам.

(Магілеўская круга).

Да 23 верасьня падпіска на пазыку па ўсёй акрузе складае 1231735 руб. ці 113,8 проц. заданьня. З асаблівым посьпехам прайшла падпіска сярод рабочых і служачых, якія падпісаліся на 1085 тысяч рублёў—135,5 проц. кантрольнай лічбы. Слабыя вынікі дала падпіска сярод сялянства—толькі 112.330 руб. або 53,5 проц. заданьня, яшчэ горш праведзена праца па распаўсюджваньню пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва--выканана толькі 48 проц. заданьня.

Нельга пахваліцца і дасягненьнямі ў галіне афармленьня падпіскі як у горадзе, так і па раёнах. Тут вінаваты мясцовыя камісіі садзейнічаньня, якія не сьпяшаюцца з афармленьнем калектыўнае падпіскі. Слаба працуюць у гэтым напрамку і раённыя камісіі садзейнічаньня.

Дырэктыў дадзена больш чым дастаткова, але яны амаль нікім не праявяроюцца. Дзе-ні-дзе кулацтва і заможная частка вёскі спрабуе ўнесьці перашкоды ў кампанію па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Побач з кампаніяй па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі праводзіцца праца за ўтрыманьне аблігацый ранейшых пазык, але пакуль што вынікі слабыя.—Недастаткова растлумачваецца насельніцтву аб карысьці ўтрыманьня пазык на вызначаны тэрмін.

Часам адказныя працаўнікі крэдытных устаноў самі даюць прыклад сваім калектывам на прадажу аблігацый. Так, кіраўнік Магілеўскага аддзяленьня дзяржбанку т. Раскін прадаў свае аблігацыі, а за начальствам пацягнуліся і іншыя працаўнікі аддзяленьня,—у выніку больш паловы працаўнікоў прадалі свае аблігацыі 2-й пазыкі. На аддзяленьню дзяржбанка раўняецца і калектыў Аксельбанку, разважаючы—чым мы горш.

Можна прывесьці шэраг выпадкаў, калі адміністрацыя ўтрымлівае з рабочых грошы для ўплаты першага ўзносу па калектыўнай падпісцы, але не здае іх своечасова ў крэдытныя ўстановы.

З усімі гэтымі недахопамі трэба хутчэй пакончыць і мабілізаваць усе сілы на разгортваньне кампаніі па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы, а таксама неабходна ўзмацніць працу па ўтрыманьню аблігацый ранейшых пазык.

Падпісваемся і выклікаем.

Адбылася нарада прафупаўнаважаных пры Смалявіцкім МК саюзу працасьветы. Заслухаўшы пытаньне аб 3 пазыцы індустрыялізацыі была вынесена пастанова правесьці падпіску сярод асьветнікаў на 120 проц. месячнага заробку, а таксама выклікаць асьветнікаў Лагойскага райёну падпісацца на 120 проц

Л. Р.

ЦІМ. ЗАРЭЧНЫ.

СЛАБАДЗКАЯ ГАРА.

(Нататкі з дарогі).

Да нашага вялікага зьдзіўленьня, у Прапойскім крэдытным таварыстве мы пачулі да немагчымасьці сьмешнае пытаньне:

„Што такое калгас“?

Запытаўся не працаўнік крэдытнае ўстановы (яшчэ гэтага не хапала!), а адзін жыхар мястэчка Прапойску, малайчына гадоў 25, па-гарадзкому апрануты: кепі, тужурка, чаравікі „бульдог“.

Выдадаў з гэтага дробнага факту мы ня зьбіраемся рабіць, але ўсё-ж такі на хвіліну спыніцца, падумаць аб тым-другім трэба, і ў першую чаргу Прапойскаму райвыканкому і розным арганізацыям, што знаходзяцца на тэрыторыі райёну.

Чалавека, які-б ня ведаў слова «калгас», у вёсцы Новай-Слабадзе ня знойдзеш, дарма што яна знаходзіцца ў двух кілёмэтрах ад мястэчка, абываталі якога заглядаюць у энцыклёпэдыю за расшыфроўкай незразумелага, дзіўнага, невядома адкуль узятага слова. Зайдзеце ў кожную хату—з францонам і варотамі на дзьве паловы, заткнутымі рызьзём вокнамі і драбінамі замест варот,—усюды кожны селянін перавядзе гутарку на Слабадзкую гару, на сваё і чужое, на жаданае і варожае слова «калгас».

— Найсьці ў калгас—пядзіва, але адзіному нелк нязручна.

— Парэжуць, як капусту...

Два погляды ў вяскоўцаў на Слабадзкую гару: адны кажуць, што куды-б было лепш жыць, каб далучыліся да „Чырвонага Кастрычніка“; другія-ж пужаюць вайной, палякамі, ангельцамі, нават чытаюць кніжкі аб Парыскай камуне: „от і вам так будзе, як францускім маратам“.

Васемнаццаць чалавек беднякоў арганізавалі сёлета сельска-гаспадарчую арцель, але заможнікі плёткамі ды словам кулацкім разбурылі бядняцкае аб'яднаньне. І засталіся беднякі на сваіх уласных, непарушных, з межамі, ды бяз хлеба, палосках.

Жыць трэба, а з чаго? Грошы патрэбны, а дзе іх узяць? Працаваць хочацца, а дзе работу знайсьці?

Кідаюць гаспадарку—каня—дыб-дыб, карова—кілішак малака, хата—у розьвіны да на полымя,—ідуць плытагонамі на Проню і Сож. На Прыбускай, Галавіцкай, Зарэчанскай, Робцаўскай—не палічыць іх—на прыстанях вяжуць гужбою бярвеньні і плывуць да Прапойску і за Прапойск, да Гомелю і на Украіну, у стэпы шырокія і гарады індустрыяльныя.

Ціхая, вербаловая рэчка Ировя, спакойны, шматводны Сож, прасторны і любы бацька-Дняпро. Колькі пяшчасьця і поту рабочага нясуць сінія, срабрыстыя, чорныя хвалі вашы!

* * *

Вёска Новая-Слабада налічвае дзевяноста двароў. Бедна жывуць сяляне, як і наогул у Прапойскім раёне. І асабліва яскрава ў бядняцкай вёсцы вызначаюцца заможныя гаспадаркі. І асабліва бязьлітасная клясавая барацьба ідзе пры гэткіх абставінах. І асабліва патрэбнай зьяўляецца тут арганізацыя беднаты, дапамога ёй, кіраўніцтва калгасным рухам. Але, нажаль, апошняга раней што ня было, ды і зараз толькі нараджаецца нешта падобнае да кіраўніцтва.

Спачатку ў вёсцы пашлі чуткі аб земляўпарадкаваньні. Перайсьці на пасёлкі, хутары, адрубы, — куды-небудзь і як-небудзь, — абы не заставацца ў вёсцы, у Новай-Слабадзе — астрозе злыдні.

Заможнік шпарка зрабіў пераацэнку новых абставін і пачаў весьці новы наступ у новых фармах і з новай тактыкай. Былі складзены сьпісы беднаты з прыгаворамі, у якіх рашуча пісалася, што беднота не жадае земляўпарадкаваньня, бо ёй і так добра жывецца. Наверыла акруга і ня ўключыла Новую Слабаду ў агульны плян земляўпарадкаваньня.

Праз два гады, улетку 1928 году, зноў пашлі чуткі аб земляўпарадкаваньні. Тады і зьявілася слабодзкае новае слова—„калгас“. Дзевяць беднякоў арганізавалі сельска-гаспадарчую арцель і назвалі яе „Чырвоны Кастрычнік“. Дзьве ўдавы, што некалі давалі подпісы аб нежаданьні земляўпарадкаваньня і жыта кулакам на паездку ў акрэсьнаддзел, першыя запісаліся ў калгас.

Шпарка зьмяняецца псыхалёгія чалавека, як колер вады на Сожы, як кавалак жалеза, або вецер наўдзёвы. І трэба ўмець улічваць зрухі народнае псыхікі, накіроўваць у вызначанае логва — на стварэньне чалавечых умоў жыцьця, на пабудову сацыялістычнае гаспадаркі.

Сёлетняй вясной узяліся за пабудову „новых даноў“. „Новыя дамы“—старыя хаты, тыя самыя, што стаялі ў вёсцы, гарбатыя ды з чупрынай, бяз вокан, ды з „бальконамі“, „вэрандамі“ і прызьбамі з вуліцы. Кожная вясковая хата — прадзеды і дзяды, бацькі і маткі, сьвёкры і залоўкі, браты і сёстры, шваграньні і надчаркі, сыны і дачкі, дзеці і парасяты, куры і цяляты—самы сапраўдны непадроблены „карлік-калгас“.

У „Чырвоным Кастрычніку“ крыху інакш: парасяты маюць асобнае памяшканьне, хутка цялятам дадуць куток у агульнай пуні, а куры—„радзімец іх перакрышы“ — на кірмаш паехалі гуляць. Астатнае ўсё тое-ж самае; сямяцьцё на масту і рызьзё—дабро сялянскае—на шастох, на печы, на падлозе; на шыле вакон мухі памалявалі карту з Карпатамі, Альпамі і Міжземным морам; „Мікола і „багародзіца“ строга глядзяць на сяброў калгасу. Але і ў „тым-жа самым“ ёсьць нешта „ня тое-ж самае“: поплеч „са сьвятым лікам“ Сарафіма сароўскага вісіць плякат „Беларускай Вёскі“, які заклікае зараз-жа падпісацца на газэту, а ніжэй „гаўрылы-архангела“ знашоў месца лёзунг: „У здаровым цела—здаровы дух“.

Перапялося новае са старым. Межаў акрэсьленых ня вызначыш ні таго ні другога. Кожны сябра калгасу можа назычыць вам ковае—энтузіязм, энэргію, веру ў перамогу і разам з тым ён-жа мае заганы і недахопы старога —некультурнасьць, якая даходзіць да няпісьменнасьці, беднасьць — ласкут чырвонага андарака ў шыбе вакенный.

Дзевяць двароў, дзевяць коняй, дзевяноста гэктараў зямлі—гаспадарка камуны, экапамічныя падставы для жыцьця. Ну яшчэ 22 каровы на 49 душ. Ну, яшчэ капа энтузіязму, — на мажары не забярэш і ўсімі конымі калгасу з месца не пасунеш.

Цікавата бывае камунарам. Будынкі ня скончаны, зямля няўгноеная, неўраджайная. Шмат працы трэба пакласьці на Слабадзкую гару—жвір да пяскі, каб ператварыць пустэш у багатую ніву. І яны працуюць ад раньня да ядранага перасьнёўскага вечара: крыюць хаты, лапяць пуні, складаюць сяніцы. На полі вырасьлі авёс і пшаніца, на гародах — турнэпс і капуста, а ў цэнтры—будынкі калгасу. Сярод вуліцы шост паставілі мэтраў 10—радыё-антэна—і годзе, чырвоны сьцяг прымацавалі да яго.

— Нашто гэта вам?

— Няхай ведаюць вяскоўцы, багатыя ды заможныя, што мы жывем... і працуем.

Дзед Дяніс, карапасты „дубавік“, вэтэран пытагонаў Прапойску, адкрыта ўхмыляецца і жартліва расказвае:

— Сабраліся нешта раз мужчыны на вуліцы. Той аб тым, той аб другім, пра жыта, пра авёс, пра Грыпіну ды Куліну. Тады Янка і кажа:— «давайце слуп закапаем, ды чырвоны сьцяг павесім“. Сказаў жартам, а вышла дзелам. Куды ня ідзі—на луг, на Слабаду, на шашу, або да лесу—адусюль сьцяг відаць. Няхай вісіць на зло Слабадзе.

А Слабада кулацкая сапраўды злая. Пасевы калгасу травяць; і не выпадкова, а знарок, сьвядома коні і каровы на засеянае жыта пушчаюць, на капюшыну і на бульбу. Зварочаліся да сельсавету за дапамогай—ніякіх захадаў ня прымаюць. Калгас ніяк ня можа справіцца з аховай засеянага: ня тут, дык там, не каля вёскі, дык ад лесу пусьцяць коні конюхі і патравяць зялёную руць. Гэта адна з форм кулацкага наступу на калектыўную гаспадарку, своеасаблівая блёкада павінна сустрэць самы рашучы і жорсткі адпор. «Не мытьем, так катаньем“ кулацкай фіёзофіі павінна быць супроцьстаўлена лава падсудных і штраф.

* * *

Я зараз успамінаю імкненьне палагею:

— Лён—у кааперацыю, а нам—мануфактуру.

Ён горак год, яна няпісьменная, але энэргічная, разумная жанчына. Яна нікольні не падобна да дэлегаткі—«бой-бабы», або мітынговай „ёклы—„і будзе ў нас хлеб, і будзе палако, і будзе цёплая хата»,—Халеева Палагея—тып рухавай, разумнай жанчыны: і косіць, і жне, і гаспадарку вядзе лепш за Янку Канцавога і Макара Непаседу.

— Толькі вось кааперацыя матэрыі не дае нам.

Мы сядзімо на прыводзе малат

ГАНДЛЯРСКА-КУЛАЦКАЕ ГНЯЗДО У ПРАФТЭХШКОЛЕ БУДАЎНІКОЎ.

У менскай прафтэхшколе будаўнікоў і да гэтага часу вучыцца шмат гандляроў і кулакоў. Вядомы гандляр Рыклін, бацькі якога трымаюць буйны антэкарскі магазын; Лібінсон (2 вучні)—бацькі таксама буйныя гандляры; Махліна—гандлярка самагонам; Віленская—маці гандлярка; Кац—таксама бацькі займаюцца гандлем, Мірскі—бацька ўласнік 3-х камянніц; Кудзін—кулак, мае каля 40 га зямлі, і шэраг іншых дробных гандляроў і заможнікаў.

Трэба адзначыць, што некаторых гандляроў і кулакоў добра ведала ўся прафтэхшкола, але чамусьці ні вучком, ні камсамольская ячэйка ніякіх захадаў да іх звальнення ня ўжылі.

Амаль усе гандляры і кулакі зьяўляліся членамі ЛКСМБ, але чамусьці камсамольская ячэйка нічога не зрабіла, каб іх выключыць са свайго складу. Ячэйка ўвесь час вяла грызьню, у ёй пры разборы пытаньня аб антысэмітызьме ўтварыліся два лягеры і прыхільнікі антысэмітаў і прыхільнікі шавіністаў. Цікава тое, што загадчык школы добра ведаў некаторых гандляроў, але не хацеў выключыць іх з прафшколы. І толькі калі РСІ дазналася пра гэта і загадала ў тэрміновым парадку зволіць іх, то заг. школы прымушан быў гэта зрабіць. Калі адміністрацыя з вялікім жалем расталася з некаторымі гандлярамі, то гандляры пашлі лазіць па ўстановах, каб іх дзіцяці прынялі назад у школу, і нейкім чынам ім удалося дастаць паперку наступнага зьместу:

„Калі ёсьць магчымасьць—васстанавіць, але ў тэрміновым парадку пазбавіць інтэрнату".

І тут адміністрацыя прафшколы паказала яскрава свой кулацкі твар. Адміністрацыя з вялікай прыемнасьцю прыняла назад у школу гэтых гандляроў, а што датычыцца інтэрнату, то яны і па сёньнішні дзень займаюць пляшчу ў інтэрнаце, у той час, як некаторым бедным прафшкольцам няма дзе падзецца. Адміністрацыя ў асобе Каліны і Германа Буклея па просьбе заможніка Тафеянкі, пераводзіць з II клясы (б) у II клясу (а), што складае 3 гады навучаньня, бо ў II клясу (б) прымалі з ведамі пяцігодкі, а ў II клясу (а) з ведамі сямігодкі.

Пры раздачы стыпэндый, старшыня камісіі Герман усімі сіламі імкнуўся, каб задаволіць гандляроў і кулакоў,—у выніку чаго шмат гандляроў і кулакоў атрымалі стыпэндыі.

Калі вучань Матусэвіч, у якога Герман зьняў самастойна стыпэндыю, заікнуўся што ёсьць РСІ, то Герман наваліўся на Матусэвіча:—Што? РСІ! Да што мне РСІ, калі я сам РСІ! Я вам пакажу РСІ! Хто пойдзе ў РСІ, той усёроўна стыпэндыі не атрымае!

Але Матусэвіч не паслухаў грознага начальства і пашоў у РСІ, дзякуючы гэтаму і атрымаў стыпэндыю.

Калі ў часе працы ў цэхах ня было матар'ялу, а па клясах ня было настаўніка па чарчэньню, то загадчык школы сказаў: Дайце мне па 2 рублі за лекцыю і я буду выкладаць. А да гэтага часу, калі праца зрывалася, заг. школы ня ўзяўся за працу—яму мала было грошай. Калі на агульным сходзе, некаторыя таварышы сталі выказвацца, што загадчык няправільна зрабіў, то зараз-жа ўстала грознае начальства. „У астрог, у Допр! Я вас навучу, як на загадчыка наводзіць хлусьню!

Невядома, колькі гаварыў-бы гэтак заг. школы, каб яго не перабіў Герман:—хто выступае тут, доўга не пабудзе ў школе!

Выступленьне грознага начальства з грознай прамовай прымусіла некаторых прафшкольцаў змаўчаць, але ня ўсіх. Агульны сход знашоў, што заг. школы сарваў крэдытаваньне вучняў і абюракраціўся: калі да яго зьвернешся са справай, ён адказвае:—прыдзі заўтра! — а назаўтра зноў „заўтра" і г. д. Заг. школы сарваў выкладаньне чарчэньня супыніў працу ў цэхах і г. д.

Пратакол сходу быў паслан на школьны савет, дзе і да гэтага часу ляжыць у заг. школы.

У сучасны момант, калі наша ўлада і партыя праводзяць чыстку савецкага апарату, „гэроі" прафтэхшколы ўцяклі ад гэтай чысткі: заг. школы Каліна кінуў загаданьне і нейдзе ўжо атрымаў новую пасаду, а Герман, заг. навучальнай часткай, ад чысткі ўцёк на раён і таксама атрымаў пасаду.

У сучасны момант, як уцякло грознае начальства, камсамольская ячэйка разгарнула сваю працу: яна зараз вычышчае гандляроў з інтэрнату і зьбірае весткі аб сацыяльным стане іншых падазроных тыпаў, але наконт вычышчэньня са складу вучняў гандляроў і кулакоў яна нічога ня робіць.

Трэба як мага хутчэй выжыць гэтыя шкодныя нам элементы. Трэба каб Каліна і Герман панесьлі кару за свае злачынствы, бо дзякуючы ім пралетарскі склад вучняў значна парадзеў.

У. Лапша.

Да месячніка дапамогі дзецям.

Удзел грамадзкасьці ў справе ба рацьбы з бяспрытульнасьцю.

Справа барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю ёсьць частка агульнай справы нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

На фронце культурнай рэвалюцыі мы шпаркімі крокамі ідзем уперад, выконваючы задачы камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня, падрыхтоўваючы барацьбітоў за ахову і узмацненьне заваёў Кастрычнікавай рэвалюцыі, будаўнікоў камуністычнае грамады.

Поспехі барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю правільна растлумачыць толькі адзінай партыяй камуністаў-бальшавікоў, толькі пад яе кіраўніцтвам савецкая ўлада разьвязвае вялікую праблему — зьліквідаваньне дзіцячай бяспрытульнасьці і бездагляднасьці, як адзэй з чарговых задач культурнае рэвалюцыі і будаўніцтва сацыялізму і якая можа быць выраша выключна ў нашай дзяржаве.

Дзіцячая бяспрытульнасьць зьяўляецца, галоўным чынам, спадчынай імпэрыялістычных бояк, якія зьявіліся крыніцай параджэньня бяспрытульнасьці.

Калі ў сучасны момант капіталістычныя дзяржавы рыхтуюць новую бойку супроць СССР гэтая пагроза вайны ёсьць адначасова пагрозай вырваць з шэрагу працоўных мільёны бацькоў, матак, братоў і сясьцёр і зноў выкінуць на вуліцу мільёны — „бяз віны вінаватых" дзяцей.

Барацьба рабочых і сялян Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету супроць вайны ёсьць у той жа час барацьба супроць новай бяспрытульнасьці.

Барацьба з бяспрытульнасьцю ў нас ёсьць у той-жа час барацьба за новую, камуністычную грамаду.

Ня гледзячы на тое, што дзяржаўнымі органамі і грамадзкімі арганізацыямі да сучаснага моманту пароблена значная работа ў справе барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю, усё-ж такі агульнае становішча бяспрытульнасьці ў сучасны момант застаецца яшчэ напружаным.

У вёсках, мястэчках і гарадох ёсьць шмат безнаглядных дзяцей-сірот, напалову сірот і наогул дзяцей беднаты, якія маюць патрэбу, як у працы, таксама і ў матар'яльнай дапамозе.

Аграрная перанаселенасьць вёскі, цяжкае матар'яльнае становішча часткі насельніцтва мястэчак, прымушаюць гэтых дзяцей, [illegible] ня могуць прыстасавацца да працы, [illegible] атрымаць матар'яльную дападогу на месцы, ісьці ў горад.

Прамысловасьць БССР ня можа яшчэ прыняць на працу ўсіх падлеткаў, апошнія, апынуўшыся бяз працы і належнага кіраўніцтва, часта незалежна ад іх трапяць у апрацоўку псаваных бяспрытульных, робяцца самі потым анархічнымі, сацыяльна-небяспечнымі. Апошніх вельмі цяжка потым выхоўваць, калі яны ўжо пападаюць у дзіцячыя дамы.

ЦК КП(б)Б адпаведнай пастановай усклаў абавязкі на ўсё органы савецкай улады, якія праводзяць працу па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю, зьліквідаваць вулічную дзіцячую бяспрытульнасьць у працягу 2-х гадоў, і агульную ў працягу 5-ці гадоў, што [illegible] народнае гаспадаркі і культуры. Выкананьне гэтай пастановы ёсьць частка агульнай задачы нашай краіны — будаўніцтва сацыялізму. Гэта магчыма выканаць, калі справа барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю ня будзе справай толькі паасобных камісарыятаў, паасобных устаноў. Яно будзе выканана, калі будзе праводзіцца пры ўдзеле ўсёй савецкай грамадзкасьці. Шырокая мабілізацыя савецкай грамадзкасьці ад цэнтру да вёскі на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю і безнаглядасьцю—ёсьць задача сёньняшняга дню. Гэтая задача можа быць выканана шляхам шырокага разгортваньня працы вакол таварыства „Прыхільнік Дзяцей", як у горадзе, гэтак і на вёсцы, шляхам ажыцьцяўленьня тых практычных задач, якія стаяць у працы таварыства „Прыхільнік дзяцей", у справе аховы дзяцінства, у справе змаганьня з дзіцячай бяспрытульнасьцю і безнаглядасьцю.

Зараз праводзіцца па Менскай акрузе месячнік дапамогі бяспрытульным дзецям.

Задача месячніку—ня толькі сабраць неабходныя матар'яльныя сродкі. Больш грунтоўная задача—гэта ўзьняць і разгарнуць актыўнасьць шырокай партыйна-савецкай грамадзкасьці вакол пытаньняў барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю, вакол працы таварыства „Прыхільнік дзяцей".

Толькі ў гым выпадку, калі таварыства „Прыхільнік дзяцей" сапраўды стане масавай арганізацыяй рабочых і сялян, калі задачы таварыства „Прыхільнік дзяцей" стануць вядомымі і тым самым блізкімі шырокім колам працоўных, калі ўсе сілы савецкай грамадзкасьці будуць кінуты на барацьбу з сацыяльным злом—дзіцячай бяспрытульнасьцю,—толькі тады мы можам быць упэўнены, што вялікая справа па палепшаньні жыцьця дзяцей стала на верны шлях і дасьць добрыя вынікі.

У першую чаргу ў гэтым нам павінны дапамагчы партыйныя, камсамольскія, піянэрскія арганізацыі, прафэсыянальныя органы і жаночыя дэлегацкія сходы.

Яны павінны разгарнуць самую шырокую ініцыятыву мас вакол гэтай справы.

Ул. Сяліванаў.

Рабселькоры нам пішуць.

КРАСНАЛУЦКАЕ ЛЯСЬНІЦТВА КУЛЬТЫВІРУЕ... БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ.

Красналуцкае лясьніцтва Халопеніцкага райёну шкадуе адпусьціць на ачыстку старой канавы 200 рублёў, дзякуючы чаму гіне ад балота 2.000 дзесяцін сенажаці. Чаму?

— Ды вось таму, што лясьнічы будзе хутка пераведзен у Менск на высокую пасаду,—кажуць сяляне, куду яму цяпер займацца такою драбніцай, як асушка 2000 дзесяцін сенажаці!

К. П.

КАЛГАС «КІН», ПАДЦЯГНІСЯ.

Калгаснікі калгасу „Серабранка" падпісаліся на 3 пазыку на 300 р., а калгаснікі з калгасу „Кін" падпісаліся на 135 р., ня гледзячы на тое, што апошні калгас шмат мацнейшы за першы, бо мае вялікі даходны сад. Трэба падцягнуцца.

Газдуруя.

ПАМАЖЭЦЕ НАМ.

Па ініцыятыве моладзі сяляне вёскі Абчугі набылі радыёпрыемнік, на які патрачаны ўсе сабраныя грошы. Больш тыдня б'юцца сяляне і ня могуць устанавіць радыёпрыемнік. Ня ведаем, да каго зьвярнуцца з просьбаю аб дапамозе.

Адамчук А.

БЮРАКРАТ БОГУШ.

Сэкратар Тураўскага РВК зафанабэрыўся. На просьбу брыгадзіраў, вылучаных рабочымі па чыстцы савецкага апарату у Тураўскім раёне адказвае: „Ідзеце, вунь там сядзіць нам. старшыні РВК, ён вам дасьць падводу", а калі брыгадзіры зьвярнуліся да „вунь таго", дык і той адказваўся... Толькі праз пяць гадзін пад націскам райкому КП(б)Б Богуш „зьлітаваўся" і даў падводы для паездкі брыгадзіраў на працу ў сельсаветы раёну.

Брыгадзір С-н.

ДА УТВАРЭНЬНЯ ТАВАРЫСКІХ І СЕЛЬСКІХ СУДОЎ.

НА ПЛЕНУМЕ ВЯРХОЎНАГА СУДУ БССР.

Каб наблізіць суд да мас і вызваліць народныя суды ад дробных і бытавых спраў у пачатку 1929 г. у кожным раёне БССР былі арганізаваны у выглядзе вопыту сельскія суды (па аднаму на раён).

За кароткі час сельскія суды паказалі станоўчыя вынікі працы ў сэнсе наближэньня суду да насельніцтва.

У 17 сельскіх судоў за 4 месяцы паступіла 358 спраў. Разгледжана за гэты час 261 справа.

У большасьці яны разглядаліся ў двох тыднёвы тэрмін. Пераважная большасьць усіх вырашаных спраў—аб патрав ах, грамадзкі іск, зьневажаньне і інш.

Са ўсіх вырашаных толькі 15 было абскарджана ў вышэйшыя судовыя інстанцыі. Гэта гаворыць за тое, што сельскі суд з сваімі абавязкамі справіўся: ён заваяваў за кароткі час аўтарытэт, ён здолеў правільна вырашыць дробныя сялянскія бытавыя справы. У часе судовых пасяджэньняў захоўвалася цішыня і парадак; насельніцтва з вялікай увагаю слухала паказаньні сьведак і не перашкаджала сваім гоманам, як гэта звычайна бывае на сялянскіх сходах, свайму суду у працы.

Аснаўныя недахопы працы маладога сельскага суду—залежваньне спраў, асабліва ў летні пэрыяд, калі склад суду знаходзіцца на палявых работах.

Былі і іншыя памылкі ў практыцы сельскіх судоў, як, напрыклад, справы крымінальнага характару разглядаліся, як грамадзкія.

Вядзеньне спраў—самае простае, бяз усякіх канцылярскіх хітрасьцяў, уласьцівых іншым судом. Быў выпадак, калі на пасадзе старшыні сельскага суду ў адным з раёнаў апынуўся былы народны судзьдзя.

Вось ён і завёў там такія парадкі і формы, якія маюць месца ў нарсудах. Калі яго потым зьнялі з працы за п'янства і сувязь з кулацтвам, то аказалася, што яго замяніць таварышом не юрыстам не прадстаўлялася ніякае магчымасьці. Новаабраны судзьдзя з асяродку батрацтва ня здолеў павесьці справы так, як яго папярэднік.

А ў другіх раёнах, дзе ня было гэтага, судовыя справы разглядаліся больш паспяхова, бяз усякай лішняй працэдуры, а таму былі больш блізкімі сялянам, і далі больш станоўчыя вынікі.

На пленуме адзначана недастатковасьць увагі з боку акрсудаў да працы сельскіх судоў ў сэнсе сыстэматычнага інструктаваньня народных судзьдзяў, якія недастаткова ацанілі грамадзка-палітычнае значэньне гэтых судоў, як форму уцягненьня працоўных мас у вырашэньне дробных бытавых спраў. Нарсуды і акрсуды не інструктавалі сельскіх судоў у плянавым парадку, у выніку чаго наглядаецца разнастойнасьць у працы і імкненьне сельскіх судоў да увядзеньня у сябе форм працэсу нарсудоў.

Раённыя выканаўчыя камітэты і сельсаветы на мясцох не аддалі дастатковай увагі працы сельскіх судоў, у выніку чаго заўважана загружанасьць старшыні сельсудоў іншай працай, адсутнасьць плянавасьці працы, несваечасовы разгляд спраў, у некаторых выпадках маруднае выкананьне пастаноў сельсуду і недастатковае забесьпячэньне гэтых судоў канцылярскімі прыладамі.

Зьўважана таксама, што некаторыя сельсуды неправышалі свае правы, як, напрыклад, разгляд спраў падзелу маёмасьці, што, згодна палажэньня, не ўваходзіць у кампэтэнцыю сельскага суду..

Мясцовыя органы ўлады не прынялі належных мер да шырокай папулярызацыі судоў пры сельсаветах і да падняцця іх аўтарытэту сярод працоўнага насельніцтва шляхам арганізацыі разгляду спраў намясцох і заслухоўваньня справаздач сельсудоў на пленумах сельсаветаў.

Установлена, што ў працу сельсудоў ня ўцягнуты жанчыны, якія зусім адсутнічаюць у якасьці старшыню гэтых судоў.

Пленум Вярхоўнага Суду пастанавіў арганізаваць сельсуды пры ўсіх сельсаветах рэспублікі з прадастаўленьнем ім дадатковага права разгляду дробных бытавых спраў, якія шырока распаўсюджаны на вёсцы. Справы-ж паклёпу і падзелу маемасьці будуць перадавацца на разгляд нарсудоў.

Перад прэзыдыумам ЦВК будзе ўзьнята хадайніцтва аб зьмене для сельсудоў санкцый артыкулаў КК, падсудных сельсудом у межах: назначэньня штрафу да 50 рублёў, альбо прымусовых работ да 4-х тыдняў.

Дзеля ўстанаўленьня аднастайнасьці ў працы сельсудоў НКЮ неабходна тэрміново выдаць спэцыяльную папулярную брашуру, у якой будуць пералічаны правы і абавязкі пэрсанальнага складу нарзасядацеляў сельсудоў.

Каб яшчэ больш падняць аўтарытэт сельсудоў і ўсмацніць сувязь іх з гушчамі працоўнага сялянства, а таксама дзеля вабясьпячэньня вытрыманай клясавай лініі ў іх працы, РВК і сельсаветам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на больш уважлівы падыход пры абраньні старшынь і членаў сельсуду з асяродку актыўных беднякоў, батракоў, сельгаспрабочых і найбольш перадавых сераднякоў. Пры гэтым старшынямі сельсудоў выбіраць тых таварышоў, якія ня маюць вялікае нагрузкі па іншых галінах грамадзкае працы.

Побач з арганізацыяй сельскіх судоў на вёсках пленум Вярхоўнага Суду лічыць неабходным арганізацыю таварыскіх судоў на прадпрыёмствах, бо як паказаў вопыт працы таварыскіх судоў у Менску, а асабліва ў Гомельшчыне, гэта справа знайшла добры адбітак на выхаваньні працоўных, а таксама наблізіць рэволюцыйную законнасьць да шырокіх мас рабочае клясы.

Кампэтэнцыя таварыскіх судоў, як і сельскіх судоў, будзе значна пашырана, а дзеля кіраваньня ўсёю працаю таварыскіх судоў трэба будзе ў хуткім часе стварыць сталы інструктаж, прымацаваўшы праз акруговыя суды тых нарсудзьдзяў у райёне яких існуюць таварыскія суды і часцей заслухоўваюць інфармацыі аб дзейнасьці таварыскіх судоў а таксама склікаць нарады членаў таварыскіх судоў раз у 6 месяцаў.

Акрсудом неабходна будзе сачыць за дзейнасьцю таварыскіх судоў, а больш здольных таварышоў, якія набылі практыку на пасадзе старшынь і членаў гэтых судоў, высоўваць на пасады нарсудзьдзяў, гэтым самым выконваючы пастанову нашай партыі аб арабочваньні судовага апарату.

С.

ХРОНІКА.

У цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе.

Надоечы пад старшынствам тав. ХАЦКЕВІЧА адбылося пасяджэньне Цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе.

Былі абгавораны справаздачы Магілеўскай акруговай камісіі садзейнічаньня і Шклоўскай раённай у галіне рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Праца Магілеўскай акруговай камісіі прызнана ня зусім здавальняючай: слаба разгорнута кампанія па распаўсюджваньню пазыкі ў вёсцы, слаба таксама праводзіцца праца па ўтрыманьню аблігацый ранейшых пазык. Каапэрацыя ўсіх відаў амаль нічога ня робіць у галіне рэалізацыі пазыкі. Толькі ў адным Клімавіцкім раёне спрад сялянства заданьне па рэалізацыі пазыкі выканана больш чым на 100 проц.

Магілеўскай камісіі даручана разгарнуць больш шпаркім тэмпам рэалізацыю пазыкі ў вёсцы, а таксама зьвярнуць максымум увагі на працу па ўтрыманьню аблігацый ранейшых пазык. Даручана таксама апрацаваць шэраг мерапрыёмстваў для прэміраваньня сацыялістычнага сэктару на вёсцы, дзе добра пастаўлена справа рэалізацыі пазыкі. Вылучана камісія з 3 асоб для выпрацоўкі канкрэтных пастаноў па абодвых дакладах.

У Прэзыдыуме ЦСПСБ.

Узмацніць збор сродкаў у фонд індустрыялізацыі.

Як паказала праверка, збор сродкаў у фонд індустрыялізацыі саюзамі праводзіцца недастаткова энэргічна. Збор слаба праходзіць па саюзах—папернікаў, мэталістаў, сувязі, хімікаў і інш. Згодна вестак сабрана толькі 146 т. р.

Прэзыдыум ЦСПСБ, абгаварыўшы гэта пытаньне, запрапанаваў ЦП саюзаў тэрмінова праверыць своечасовасьць збору і адсылкі сродкаў акруговымі аддзяленьнямі і нізавымі ячэйкамі ў адпаведныя інстанцыі.

Збор сродкаў ад 1 дню індустрыялізацыі павінен скончыцца 5-га кастрычніка.

Дапамога [illegible] працы ЦП саюзу савгандльслужачых.

У сувязі са зьмяшчэньнем у 219 нумары нашай газэты артыкулы, аб скажэньнях у працы ЦП савгандльслужачых, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў правесьці датэрміновае абсьледваньне працы цэнтральнага праўленьня.

Для правядзеньня праверкі запрошан прадстаўнік ЦК саюзу.

Павялічыць стыпэндыю прафшкольцам.

Прэзыдыум ЦСПСБ узьняў пытаньне перад СНК Беларусі аб хутчэйшым вырашэньні пытаньня з водпускам стыпэндый для вучняў прафшкол.

Стыпэндыя ў прафшколах, па думцы прэзыдыуму ЦСПСБ, павінна быць павялічана да 16 р.

Да тэатральнага сэзону яўрэйска га дзяржаўнага тэатру.

Прэзыдыум ЦСПСБ, абгаварыўшы пытаньне аб абслугоўваньні рабочых і сял[illegible] дзяржаўным тэатрам [illegible] пастанавіў, па прыкладу мінулага году, захаваць сыстэму закупкі паасобнымі саюзамі мэтавых спэтакляў. Ухвалена, каб на усе генэральныя рэпэтыцыі дырэкцыя запрашала культактыў саюзаў, клюбаў і прадпрыёмстваў для грамадзкага прагляду, у склад мастацкай рады тэатру увесьці рабочых з вытворчасьці.

Згодна пастановы дырэкцыі тэатру кошт аднаго спэктаклю на ўсе дні тыдню устаноўлена у 450 р.

Курсы вылучэнцаў праведзены нездавальняюча

Прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў даклад аб курсах вылучэнцаў пры Наркамасьветы.

ЦСПСБ лічыць зусім нездавальняючай усю пастаноўку працы на курсах а таксама і вынікі курсаў.

Роспуск курсантаў без узгадненьня з ЦСПСБ ня даў магчымасьці своечасова скарыстаць іх па прызначэньню. Побач з гэтым адзначаны недапушчальныя адносіны з боку НКА да выпраўленьня заўважаных ЦСПСБ і НКРСІ памылак.

ЦП саюзаў швэйнікаў, с-гасп. і лясных рабочых, хімікаў, друкароў, скурнікаў, дрэвапрацоўшчыкаў і харчавікоў зазначала на нядбайныя адносіны да пасылкі вылучэнцаў на курсы.

Распушчана Магілеўскае бюро ІТС.

Прэзыдыум Белбюро інжынэраў і тэхнікаў ухваліў расьпусьціць Магілеўскае бюро ІТС.

У Бюро за апошні час наглядаўся поўны заняпад працы, адсунічала кіраўніцтва сацыялістычнымі спаборніцтвамі і інш.

Магілеўскаму савету прафсаюзаў запрапанавана ў бліжэйшым часе правесьці акруговы зьезд спэцыялістаў.

Агульна гарадзкая канфэрэнцыя яўрэйскіх жанчын-работніц.

Менскі акруговы савет бязбожнікаў склікае на 3-га кастрычніка бягучага году агульна-гарадзкую канфэрэнцыю жанчын—работніц і хатніх гаспадынь, дзе будзе заслухан даклад аб пахаджэньні яўрэйскіх сьвят.

У раёнах і мястэчках будуць таксама праведзены антырэлігійныя жаночыя сходы.

У Белсельбанку.

Пабудова птушніцкага камбінату.

Белсельбанк адпусьціў Дзяржгандльбелу 40 тысяч руб. на пабудову птушніцкага камбінату ў Полацку.

Вапнаныя млыны.

У сувязі з тым, што ў Віцебскай і Магілеўскай акругах знаходзяцца вялікія залежы крэйды і вапны. Там будуць пабудаваны вапнаныя млыны. Белсельбанк адпусьціў на гэта 42 т. р. Магілеўск. акруговаму сельбанку 30 тыс. р. і Віцебскаму —12 тыс. р.

Пабудова халадзільніка.

Белсельбанк адпусьціў Гомельскаму Акрсельбанку 50 тыс. р. на пабудову халадзільніка ў Гомелі.

Пераапрацоўка бульбы.

У зьвязку з тым, што пачаўся сэзон загатоўкі бульбы, Белсельбанк адпусьціў Менкрэдсаюзу на перапрапоўку яе 30 тыс. р.

50640 р. на птушніцтва.

Дзяржгандльбел атрымаў ад Белсельбанку на пашырэньне птушніцтва 50640 руб.

У цэнтр. камісіі па палепшаньню быту і працы жанчын.

28 верасьня ў Маскве адбудзецца ўсесаюзная нарада прадстаўнікоў камісій па палепшаньню быту і працы жанчын. Цэнтральнай камісіяй БССР вылучана на гэту нараду трох таварышоў: т. т. Крэ[illegible], Чукашаву і [illegible] Ча[illegible] на нарадзе цэнтрам працы будзе абгаварэньне мерапрыемстваў па палепшаньню быту і працы жанчын на 1929-30 год.

Новыя дзіцячыя сады.

У бягучым годзе адчыняецца шэраг новых зімовых пляцовак: саюз мэдсанпрацы і камунальнікаў адчыняюць агульна-гарадзкі дзіцячы сад на 50 чалавек, у былой сынагозе па Савецкай вул. Белкустпрамсаюз арганізоўвае пляцоўку разьлічаную на 50 чал.

Акрамя таго, па лініі рабочай каапэрацыі і „Помдета" адчыняюцца зімовыя пляцоўкі, якія ахопяць каля 70 дзяцей.

Сацыялістычнае спаборніцтва на антырэлігійным фронце.

Менскі акруговы савет бязбожнікаў атрымаў выклік ад віцебскага савету на сацыялістычнае спаборніцтва ў правядзеньні антырэлігійнай кампаніі у сувязі з яўрэйскімі сьвятамі.

Менскі акрсавет з свайго боку рашыў заключыць саддагавор з Полацкам.

Апавяшчэньне

Сёньня (субота) 28 верасьня г. г. роўна а 7 гадз. увеч. у памяшканьні антавай залі БДУ (Земляробскі завулак) адбудзецца агульны сход працаўнікоў БДУ.

Парадак дня:

Справаздача мясцкому БДУ і рэвізійнай камісіі.

Просьба не спазьніцца.

Мясцком БДУ.

АДКАЗ АСЬВЕТНІКАЎ НАШЫМ ВОРАГАМ.

Райканфэрэнцыя асьветнікаў Любоньскага райёну, Бабруйскай акругі, заслухаўшы даклад аб нашым міжнародным становішчы, пастанавіла:

Падпісацца на 3 пазыку індустрыялізацыі на менш 100 проц. месячнага заработку. Некаторыя падпісаліся на 200 пр., а ў сярэднім падпіска будзе праведзена на 125 проц.—130 проц.

Весьці растлумачальную працу сярод працоўных за падпіску на 3 пазыку індустрыялізацыі.

Адлічыць аднадзённы заработак у фонд індустрыялізацыі краіны.

Распачаць збор сродкаў на танк „Камуніст".

Вясьці растлумачальную працу сярод сялянства за збор 1-га снапа ў фонд калектывізацыі краіны.

Канфэрэнцыя пастанавіла ўзяць шэфства над вёскай Галь і калектывам.

Канфэрэнцыя вітае ўтварэньне асобнай Чырвонай арміі на Далёкім Усходзе і шле ёй шчырае прывітаньне, 44 асьветнікі райёну запісаліся добраахвотнікамі ў гэту армію.

П. С.

— Канфэрэнцыя асьветнікаў Бярэзінскага райёну, Менскай акругі, заслухаўшы даклад аб міжнародным становішчы нашай краіны, ганьбіць белабандытаў, якія захапілі К-У. чыгунку. У адказ на гэта канфэрэнцыя адлічыла ў фонд індустрыялізацыі краіны 3 проц. і га абрану краіны 2 проц. свайго месячнага заработку.

Група пастаўнікаў у ліку 45 асоб п[illegible] далі заяву аб добраахвотным уступленьні ў шэрагі Далёка-Усходняй Чырвонай армію.

Настаўнік.

СУД.

РАСПРАВА З ЛЯСЬНІКОМ.

Вядомыя каменскія „лясуны" Пётра Дашукевіч, Зьмітро Дашукевіч і Марка Каляда шмат разоў затрымліваліся ў часе самавольнай парубкі лесу. Лясьнік Грэскага лясьніцтва Алесь Бэрнатовіч амаль кожны дзень складаў пратаколы на гэтых „лясуноў" і накіроўваў у лясьніцтва, але „лясуны" не супакойваліся.

— Рубалі лес і будзем рубаць,—казалі яны Бэрнатовічу,—а твая справа,—пакуль жыў, пісаць пратаколы.

Дашукевічы і Каляда лічыліся злоснымі парубшчыкамі лесу, шмат плацілі штрафу і на гэтай глебе мелі злосьць на лясьніка Бэрнатовіча. Нам ня жыць, а Бэрнатовічу ня служыць,—казалі „лясуны". Раніцою 9 сакавіка 1928 году Дашукевічы і Каляда, змовіўшыся, накіраваліся ў абход лясьніка Бэрнатовіча. Прыехаўшы ў сельнік, паставілі кані і пачалі раіцца, што рабіць з лясьніком Бэрнатовічам у выпадку, калі ён прыдзе, і пачалі рубаць каштоўныя дрэвы.

На стук сякер і па сьлядох хутка падышоў лясьнік Бэрнатовіч; на плячы ў яго вісела паляўнічая стрэльба.

— Хлопцы, што гэта вы робіце? Я зноў напішу пратакол!

Не пасьпеў скончыць гэтых слоў Бэрнатовіч, як „лясуны"—Каляда і Дашукевічы—з вострымі сякерамі абкружылі лясьніка. Каляда крыкнуў: „Бі, хлопцы, і першы ўдарыў Бэрнатовіча сякерай на галаве, а калі Бэрнатовіч паваліўся, Дашкевічы таксама сякерамі пачалі наносіць лясьніку раны, ад якіх Бэрнатовіч на месцы скануў. Труп лясьніка забойцы зацягнулі ў сьнег. Вярнуўшыся дамоў, злачынцы ўзялі па некалькі пудоў мукі на падводы і накіраваліся ў гацаўскі каапэратыў прадаваць, з мэтай скрыць злачынства. Але шыла ў мяшку ня ўтоіш. Злачынства было выкрыта і „лясуноў" арыштавалі. У часе папярэдняга сьледзтва Зьмітро Дашуковіч захварэў і памёр.

Выязная сэсія Менскага Акруговага суду прыгаварыла: Марка Каляду на дзесяць год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем правоў на пяць год, а Пётру Дашукевіча на восем год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем правоў на 2 гады.

Д. К.

ШАХМАТЫ № 32 (177)

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЭРСКАГА.

Задача № 30 М. Штэйна. Менск.



Бел. Кр. f7, К е2, К f2, пп е3, g3, h2
Чорн. Кр. h5, Лаб, пп а7, d5.

Мах у 3 хады

Усесаюзны чампіянат СССР закончыўся перамогай Б. М. Вярзінскага. Як шахматыст, Вярзінскі выступае ў турнірах з 1906 г. Годнасьць майстра ён атрымаў у чампіянаце СССР у 1924 г. Лепшыя яго дасягненьні: выгрыш у Багалюбава у 1925 г. у чампіянаце СССР і у Капабанкі і Рубінштэйна у Маскоўскім міжнародным турніры 1925 г. Чампіён Масквы у турніры 1928 г. Стыль гульні востры, атакуючы. Бязумоўна, Вярзінскі адзін з лепшых ігракоў Саюзу.

Партыя іграна ў міжнародным турніры 1925 г. (Масква).

Бел. Вярзінскі, чорн. Рэці.

1. е2-е4 е7-е6, 2. d2-d4 d7-d5 3. Кв1-с3 Кр. 8-f6, 4. Сс1-g5 Сf8-в4 5. е4-е5 h7-h6, 6. Сg5-d2 Св4:с3 7. в2:с3 Кf6-е4 8. Фd1-g4 g7-g6 9. Сf1-d3 Ке4:d2 10. Кр е1:d2 с7-с5 11. h2-h4 Кв8-с6, 12. Кg1-f3 с5:d4 13. с3:d4 Сс8-d7, 14. Ла1-в1 Кс6-а5. 15. Лh1-h3 Фd8-е7, 16. Фg4-f4 Ла8-с8 17. Кf3-h2 Сd7-а4, 18. Лh3-f3 Ка5-с4+ 19. Сd3:с4 Лс8:с4, 20. с2-с3 Лh8-f8. 21. Кр. d2-с1 Са4-с2, 22. Лв1-в2 Сс2:е4 23. Лf3-g3 Фе7-с7, 24. Фf4-е3 Се4-б62 25. Кh2-g4 Сg2-е4, 26. Кg4-f6+Крe8-е7 27. Лв2-в3 Лf8-h8, 28. Кf6:е4 d5:е4 29. Фе3:е4 в7-в6, 30. Фе4-f4 Лh8-d8 31. Лg3-f3 Лd8-f8, 32. Фf4:h6 Фс7-с6 33. Фh4-f4 Лс1-а4, 34. Лв3-в2 Фс6-d5 35. Лf3-d3 Крe7-е8, 36. Фf4-f6 Лf8-g8. 37. Лd3-f3 Лg8-g7, 38. Лв2-с2 Лg7-h7 39. h4-h5 Ла4:а2, 40. Лс2:а2 Фd5:а2 41. Крe1-f1 Фа2-d2 42. d4-d5! Фd2:d5 43. Крf1-е2 Фd5:а2+ 44. Крe2-е3 Фа2-с2. 45. Крe3-d4 Фс2-а4+, 45. Крd4-е3 Фа4-с2 47. Крe3-d4 Фс2-а4+, 48. Крd4-е3 Фа4-с2. 49. Крe3-d4. g6:h5, 50. Лf3-g3 Крe3-d7 51. Лg3-d3 Крd7-с6, 52. Крd4-е3 Фс2-с1+ 53. Крe3-е2, Фс1-с2+, 54. Крe2-е3 Фс2-с1+, 55. Крe3-е2 Фс1-в1+, 56. Крс3-е3 Фв2-в5 57. Фf6-f3+, Крс6-с7 58. Фf3-а8 Фв5:е5 59. Крe3-е2, Фе5-f4+, 60. Крd2-е2 Фf4-а4 61. Фа8-d8+ Крс7-в7 62. Лd3-d7+Крв7-в6 63. Фd8-с8+, Крв6-в5 64. Лd7-d5+! е6:d5 65. Фс8-d7+ нічыя. Цікавая партыя.

Сёньня а 7 гадз. увечары у клубе кустароў, Ракаўская, 13 Гавві дасьць сэанс адначасовае гульні у шахматы. Выігрышыя атрымаюць прызы. Прыносіць ігры.

Адказы карэспандэн-там.

Рабочаму.—Допіс „Дасягненьні і недахопы [illegible] фабрыцы „Дзяпроўскай Мануфактуры", Саўткіну—допіс „